Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 11 1933 г. СЕРАДА № 225 (4769) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Магілёў. Райком партыі—Рэвінскаму, РВК—Пушчыну, райпрафсавет—Шапіра

Магілёў галоўна цягнецца ў хвосце па выкананні сельска-гаспадарчых работ у прыгарадных гаспадарках. Трыкутнікі, прымацаваныя да калгасаў, не аказваюць ім ніякай дапамогі.

ЦК прапануе неадкладна забяспечыць скапчэнне ўборкі і іншых сельска-гаспадарчых работ у бліжэйшыя дні, прымацаваўшы да калгасаў адказных работнікаў.

Аб прынятых мерах паведаміце ЦК.

РЫСКІН.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б аб фактах, прыведзеных у артыкуле ў ЦО «Правда» ад 9 кастрычніка пад загалоўкам «Палітычная слепата».

Л. НІХАМКІН, В. ЗАЙЦАЎ—Галоўныя пытанні абыходзяць навучэнцы.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА. Вывады камісіі па чыстцы рэалізаваць у практычнай рабоце.

ЗА МЯЖОЙ:

Агіднасці манчжурскіх прадстаўнікоў на КУЧ не спыняюцца.

АРГАНІЗУЕМ У КОЖНАЙ МТС, САУГАСЕ І КАЛГАСЕ ПРЫЕМКУ ЗАСЕЯНЫХ ПАЛЕУ

Аб фактах, прыведзеных у артыкуле ў ЦО „Правда" ад 9 кастрычніка 1933 г. пад загалоўкам „Политическая слепота"

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

9 кастрычніка 1933 года ў «Правде» з'явіўся артыкул «Политическая слепота», у якім зусім правільна адзначана абсалютна недапушчальнае адставанне Беларусі па азімай сяўбе ў радзе раёнаў і намеціўшаяся пагроза зрыву плана азімай сяўбы (на 5 кастрычніка Чырвонапольскі — 56,4 проц., Сіроцінскі—73,0, Чашніцкі—79,9 проц., Заслаўскі—71,5 проц., Тураўскі 79,2).

«Правда» таксама зусім правільна ўказвае на палітычную слепату партыйных арганізацый Беларусі ў пытанні аб прысядзібных участках зямлі. Сакратарыят ЦК асабліва падкрэслівае, што факты незаконных прырэзак прысядзібных участкаў за лік агульнакалгаснага фонда, якія вядуць да ператварэння прысядзібнай гаспадаркі з дапаможнай у фактычна галоўную, з'яўляюцца выпікам невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасці боку раду партыйных арганізацый і адсутнасці іх выкрыць кулацкія дзеўры, накіраваныя супроць калгаснага будаўніцтва.

Не гледзячы на прамыя пастановы УсеКП(б), па рад указанняў і практычных пастаноў ЦК КП(б)Б па гэтым пытанні (пастанова аб Б.-Каўскім, Камарынскім раёнах і падобнага роду факты (артыкул «Правде») працягвае мець мес

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць Дзержынскаму і Камарынскаму РК КП(б)Б неадкладна абследзець факты, паведамленыя ў артыкуле «Правды», прыняўшы меры найстражэйшага пакарання вінаватых у кулацкім захваце зямель і прынятых мерах паведаміць ЦК.

2. Даручыць Наркамзему тав. Бенеше пазней 10 кастрычніка ўвесці выслаць у гэтыя раёны працаўных работнікаў Наркамзема для абследвання па месцы фактаў, звязаных з павялічэннем прысядзібных зямель калгаснікаў. Рэзультаты праверкі заслухаць на Сакратарыяце ЦК.

3. Сакратарыят ЦК асабліва адзначае, што факты, апублікаваныя ў «Правде», сведчаць таксама аб тым, што Дзержынскі і Камарынскі РК КП(б)Б не мабілізавалі партыйную арганізацыю па барацьбу з кулацкімі дзеўрамі, маючымі мэтай падрыў калгаснага лада, у рэзультаце чаго ў радах гэтых партыйных арганізацый у наяўнасці страта класавай пільнасці.

Сакратарыят ЦК абвяшчае вымову бюро РК Дзержынскага і Камарынскага раёнаў і папярэджвае іх, што за дапушчэнне ў далейшым падобнага роду фактаў як бюро РК у цэлым, так і сакратары РК у асаблівасці будуць прыцягнуты да найстражэйшай партыйнай адказнасці.

4. Сакратарыят ЦК лічыць, што наяўнасць падобнага роду кулацкіх спроб зруйнаваць калгасную гаспадарку абходным шляхам, не заўважаных радам партыйных арганізацый, сведчыць аб тым, што партыйныя арганізацыі ў Беларусі яшчэ зусім невыстарчальна мабілізаваліся на барацьбу супроць антыкалгасных кулацкіх вылазак, накіраваных супроць калгаснага будаўніцтва, а таксама далёка не забяспечваюць канкрэтнага апе рацыйнага кіраўніцтва калгасамі, саўгасамі, і такімі баявымі ўчасткамі работы на сяле і калгаснага будаўніцтва, як: севазварот, ход і якасць азімай сяўбы, размеркаванне даходаў, работа калгасных брыгад і г. д.

5. Сакратарыят ЦК прапануе ўсім РК КП(б)Б праверыць наяўнасць падобнага роду скажэнняў калгаснага будаўніцтва ў сваіх раёнах з прыняццем усіх мер да неадкладнага выпраўлення дапушчаных памылак і скажэнняў і прыцягненнем вінаватых да адказнасці, тэрмінова паведамляючы ЦК аб кожным падобным выпадку.

6. Прапанаваць усім РК КП(б)Б, у адпаведнасці з пастановай ЦК УсеКП(б) ад 27 сакавіка 1933 г. аб празмерным росце прысядзібных участкаў, апублікаванай у «Правде»:

а) праверыць выкананне прамога ўказання ЦК УсеКП(б) аб забароне нарэзкі зямель з калгасных зямельных фондаў для прысядзібнага зямля карыстання без дазвола вышэйшых партыйных і совецкіх органаў;

б) у выпадку незаконнай раздачы калгасных зямель прычыніць меры да іх звароту ў агульнакалгасны фонд, прыцягваючы дапусціўшых такія скажэнні да найстражэйшай судовай адказнасці, як за парушэнне закона аб калгасным зямлякарыстанні.

7. Даручыць членам бюро ЦК, якія знаходзяцца ў раёнах, прасачыць за правядзеннем гэтай пастановы, прыцягваючы на месцы да суровай адказнасці вінаватых у патуранні кулацкім спробам сарваць калгаснае будаўніцтва.

КЛІМАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА СПАДЗЯЕЦЦА НА САМАЦЁК

ШТАМПАЎШЧЫНА

КЛІМАВІЧЫ, 10. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Пакуль у Клімавічах заняты толькі тым, што без меры крытыкуюць Наркамзем БССР. Тут, моў, пераблыталі і цяпер блытаюць лічбы. Паводле раённых даных план сяўбы азімых выканан на 81 проц., а па зводцы НКЗ БССР — толькі на 62,4 проц. І сакратар райкома, і старшыня РВК, і загадчык райземаддзела без канца абураюцца на наркамземаўскую, так сказаць, несправядлівасць.

Дзіўна толькі, што раённыя арганізацыі не могуць даць ніякіх канкрэтных і грунтоўных доказаў для свайго апраўдання. Наадварот. Факты гавораць аб наяўнасці ашуканства і рапартаманіі ў практыцы клімавіцкіх арганізацый. Скрозь і ўсюды шлюцца рапарты аб стопроцантным скапчэнні сяўбы, а ў сапраўднасці планы па сяўбе значна недавыкананы (калгасы «Праўда», імя 12-годдзя Кастрычніка, імя Сталіна і г. д.).

Але, дапусцім па мінуту, што рацыю маюць клімавіцкія таварышы, а не Наркамзем БССР. Чым яны хвалюцца? Чаму абураюцца? І па сваіх-жа ўласных зводках раён да апошняга і канчатковага тэрміна завяршэння сяўбы, устаноўленага бюро ЦК КП(б)Б — 1 кастрычніка — выканаў план асенняй сяўбы толькі на 81 проц.

Прайшла яшчэ адна пяцідзнёўка. І што-ж? Зусім нязначны, зусім мізэрны крок наперад. На 5 кастрычніка план сяўбы, па раённых даных, выкананы толькі на 90,6 проц. Пустуе яшчэ каля 2.000 гектараў азімага кліна.

А ў раённым кіраўніцтве ўсё ціха і спакойна. Людзі самазадаволена заяўляюць, што «справы стаяць не так ужо дрэнна...». Шкодлае, алілуйскае самазаспакаенне.

Дэмабілізацыйныя настроі раённага кіраўніцтва перакінуліся і ў сельсоветы і калгасы. У Судзілаўскім і Салімінскім сельсоветах упэўнена разважалі: «Паспеем».

І «паспелі». Калгасы Судзілаўскага сельсовета засеялі да 5-га кастрычніка толькі 77,4 проц. азімага кліна. У Склімінскім сельсавеце аднаасобнікі яшчэ і цяпер не засеялі ні аднаго гектара. Ёсць цэлы рад сельсветаў з яшчэ больш нізкімі паказальнікамі па сяўбе: Галіцкамыскі сельсавет: калгасы — 63,4 проц., аднаасобнікі — 66,7 проц.; Малашкавіцкі: калгасы — 82,3 проц., аднаасобнікі — 45,4 проц. і т. д. і г. д.

Асабліва ў раёне адчуваецца поўнае ігнараванне працоўнага аднаасобніка, і гэта прывяло да фактычнага зрыва сяўбы азімай пшаніцы па аднаасобных гаспадарках. З усяго ўстаноўленага плана па сяўбе пшаніцы аднаасобнікі засеялі толькі адзін гектар.

Азімай пшаніцы ў раёне наогул, так сказаць, не пашанцавала. У цэлым радзе сельсоветаў сяўба фактычна сарвана. Укажам, напрыклад, па Галіцкі сельсавет, дзе па калгасах засеяна ўсяго 20 проц. азімай пшаніцы, Малашкавіцкі — 20 проц., Звенчацкі — 59 проц., і г. д. А ў цэлым у раёне яшчэ пустуе звыш 100 гектараў.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б абвясцілі суровыя вымовы старшыні РВК тав. **Буякову** і сакратару РК тав. **Алаю** за недапушчальнае адставанне па сяўбе азімай пшаніцы. Ці зроблены з гэтага вывады? Названыя намі лічбы і факты з усёй перакананасцю сведчаць, што не.

Мала таго. Т. т. Алай і Буякоў адкрыта заяўляюць, што план па сяўбе пшаніцы ў раёне выканан не будзе. І тут-жа спасылка на «аб'ектыўныя» прычыны — не хапае насення.

Па-першае, гэта няпраўда. Змаглі-ж у тым-жа Клімавіцкім раёне калгасы Аўтухоўскага, Гразевіцкага і іншых сельсоветаў поўнасцю рэалізаваць свае планавыя заданні па сяўбе азімай пшаніцы.

Па-другое, — ні РК, ні райвыканком пальцам не паварушылі, каб мабілізаваць наяўныя насенныя рэсурсы. Палітычна слепаватыя раённыя кіраўнікі не бачаць, што недабітае кулацкае ахвосце арганізуе сабатаж сяўбы. Запытайцеся ў райземаддзеле, як кулацкія гаспадаркі выконваюць цвёрдыя заданні па сяўбе. Нічога вам не адкажуць, і па той простай прычыне, што самі нічога не ведаюць.

У калгасе «Новы шлях», Раднянскага сельсовета, беспакарана арудуе кулацкая зграя. Фармальна кулакі выключаны з калгаса, але спакойна сядзяць сабе ў калгасе і зараз, атрымліваюць працадні і разбураюць калгасную вытворчасць. У калгасе «Энергія» кулацка - клерыкальныя элементы арганізавалі адкрыты сабатаж сяўбы.

Вось гэтага ў раёне не бачаць. Крычаць аб недахваце насення, а з сабатажнікамі цацкаюцца. Не бачаць і грубейшых, агіднейшых парушэнняў элементарных аграправіл пры сяўбе. У Гусарскім, Асмолавіцкім і іншых сельсоветах сеюць у аднавор, не барануюць і г. д.

***

Клімавіцкая партарганізацыя зараз праходзіць чыстку. Гэта абавязвае яе рашуча перабудаваць усю сваю работу і неадкладна пакончыць з ганебнейшым адставаннем на асенніх с.-г. работах.

С. Г—н.

МАЙСТРЫ АШУКАНЧЫХ РАПАРТАЎ

КЛІМАВІЧЫ, 10. (Па тэлеграфу ад нашых спецыяльных карэспандэнтаў).

У раёне ёсць шмат фактаў ашуканства ў рапартах аб скапчэнні сяўбы азімых. Паўтараецца ганебная практыка, калі дутымі рапартамі прыкрываўся фактычны недасеў азімых.

Калгас «Праўда», Гусарскага сельсавета, 30-га верасня рапартаваў аб перавыкананні плана па сяўбе азімых на 1 гектар.

Палітаддзел МТС выкрыў, што праўленне калгаса «Праўда» займаецца злачынным ашуканствам. У сапраўднасці калгас пры планавым заданні ў 570 гектараў засеяў усяго толькі 496,5 га. Недасеў — 73,5 га.

Праўленне калгаса «Дванаццацігоддзе Кастрычніка», Цімашаўскага сельсавета, таксама рапартавала аб скапчэнні сяўбы азімых. У сапраўднасці калгас недавыканаў планавага задання па сяўбе азімых на 26 гектараў. Калгас імя Сталіна (Міслаўвіцкі сельсавет) рапартуе аб стопроцантным выкананні пасеўнага плана. На справе-ж аказваецца, што калгас выканаў плян сяўбы азімых толькі на 60 проц.

Райземаддзел механічна штампуе даныя калгасаў і зусім не займаецца праверкай фактычна засеянай плошчы. Адным словам, цалкам паўтараецца штампаўшчына мінулага года, калі раённы земаддзел праштампаваў недасеў азімых у 4.000 гектараў супроць планавага задання.

Галкін, Пасманік.

ЯК МАСКУЮЦЦА СУСТРЭЧНЫЯ ПЛАНЫ

КЛІМАВІЧЫ, 10. (Па тэлеграфу ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

У Клімавіцкім раёне дапускаюцца шматлікія факты давядзення сустрэчных планаў па цвёрдых збожжапастаўках.

Сустрэчныя планы даводзяцца пад выглядам добраахвотнай здачы збожжа дзяржаве звыш норм, устаноўленых законам аб цвёрдых пастаўках збожжа дзяржаве.

Вось некалькі красамоўных фактаў.

Калгас «Чырвоны сцяг», Звенчацкага сельсавета, здаў 11.920 кгр. збожжа замест 10.543 кіло па нормах, устаноўленых законам аб цвёрдых збожжапастаўках.

Калгас «Звязда», Дамамерыцкага сельсавета, выканаў устаноўлены па цвёрдых нормах план збожжаздачы на 105,0 проц., калгас «Праца» — на 109 проц., калгас імя Калініна — на 102,5 проц. і г. д.

Гэтыя парушэнні закона аб цвёрдых збожжапастаўках адбываюцца з ведама і благаславення кіруючых раённых арганізацый. Яны не бачаць у сустрэчных планах «нічога ненармальнага».

Неабходна адзначыць блізарукую пазіцыю раённай газеты «Комуна». Яна не толькі не разгарнула ніякай барацьбы супроць парушальнікаў новага закона аб цвёрдых збожжапастаўках, наадварот, рэдакцыя слепа штампуе раённыя зводкі аб «перавыкананні» планаў па збожжапастаўках.

Галкін.

КАЛІ ЎЛАСНАЯ СЯДЗІБА ЗАСЛАНЯЕ УСЁ...

Калгасы Рубіжкаўскага сельсавета, Дзяржынскага раёна, ганебна зацягнулі сяўбу азімых.

Да 5-га кастрычніка буйнейшы ў раёне і сельсавеце калгас «Комінтэрн» засеяў толькі **425,5 га** жыта, замест устаноўленых планам **485.** Пшаніцы засеяна **65,52 га** замест планавых **80.** Яшчэ горш у калгасе «Комунар», дзе на 5-га кастрычніка засеяна толькі **230** га жыта замест **305** і **56 га** пшаніцы замест **70.**

Калгасы Рубіжкаўскага сельсавета адсталі па ўсіх с.-г. работах.

З 26-га верасня пачалася масавая ўборка бульбы. Аднак, тэмпы ўборкі нікуды не вартыя. Калгас «Комінтэрн» убраў **50 га** замест **178,** «Комунар» — **45 га** замест **119,65.**

Адной з асноўных прычын з'яўляецца праізмернае разбуханне прысядзібных участкаў. Перш за ўсё ўбіраюць уласныя індывідуальныя пасевы, а на калгаснае поле махнулі рукой.

Шэфская арганізацыя рапуча ставіла пытанне аб гэтым перад сельсоветам. Але былы старшыня сельсавета **ШАМКО** заявіў:

— Тое, што загароджана калгаснікам, гэта яго. Я лагаварыўся са старшынёй РВК Вансоўскім і загадчыкам райземаддзела. Яны катэгарычна забаранілі абразаць сядзібныя ўчасткі.

Адоль і вынікі. Многія калгаснікі захвацілі набольш калгаснай зямлі і потым засеялі. Першым адгародзіў для сябе сядзібу ў 2 гектары старшыня сельсавета **ШАМКО.** Адзін гектар калгаснай зямлі ўзяў для сябе старшыня калгаса «Комінтэрн» **БУДАЙ.** Такую-ж колькасць зямлі Будай адпусціў свайму лепшаму прыяцелю калгаснику **КАЧАНУ.**

Падвод калгаса «Комінтэрн» **Ф. Бараў** [illegible] усіх. Ён, як член прэзідыума [illegible] адпусціў свайму бацьку 1 гектар калгаснай зямлі пад засеў бульбы, 1 гектар пад жыта, 1 гектар пад ячмень і г. д.

Калгасніца **Дзем'яновіч** да сваіх 2-х гектараў сенажаці апрымлівае па загаду Шамко амаль гектар пад бульбу. Дагка расстраляната контр - рэвалюцыянера Кузьмецкая атрымлівае ад сельсавета за літр гаралкі і добрую закуску 2 га калгаснай зямлі. Калгаснікі з вёсак Красная, «Чырвоны маяк», Лайчыха і г. д. кожны мае дзесяцінную, а то і двухдзесяцінную сядзібу.

Да чаго гэта прыводзіць? Калгаснікі, якія маюць сядзібы ад 1 да 2-3 га, не выходзяць на работу.

Раённым кіраўнікам — **Вансоўскаму,** яго намесніку **Курэіну** — добра вядомы дзеянні **Шамко.**

Кулацкі агент Шамко, зняты з работы за кулацкую практыку, цяпер чамусці паслан... кіраваць калгасам «Новы будаўнік».

Новы старшыня калгаса «Комінтэрн» тав. **Васілец** паставіў пытанне перад калгаснікамі аб абразэцы сядзіб. Пераважная большасць калгаснікаў падтрымала ініцыятыву старшыні калгаса. Калгаснікі патрабуюць безадкладна правесці ў жыццё закон аб прысядзібных гародах калгаснікаў.

Але кулацкае ахвосце — кулакі **Бакіноўскія, Шпілеўскія, Шаціла** і інш., пралезшыя ў калгас, імкнуцца арганізаваць сабатаж. Па-ранейшаму многія калгаснікі капаюцца на ўласных сядзібах. Да «калгасніцы» **Дзем'яновіч** па яе ўласныя пасевы пашылі нават капаць бульбу 16 калгаснікі.

Трэба да канца выкрыць кулацкае ахвосце і цвёрда ажыццявіць дырэктыву СНК і ЦК аб тым, што сядзібныя участкі не павінны перавышаць 0,50 га.

А. М.

РАЗБАЗАРВАЮЦЬ КАЛГАСНУЮ ЗЯМЛЮ

У Брагінскім раёне моцна адчуваюцца кулацкія спробы парушыць устойлівае зямлякарыстанне. Кулацкае ахвосце імкнецца шляхам штучнага раздушвання ўчасткаў за лік агульнакалгасных масіваў падарваць калгасную вытворчасць, разваліць калгасы.

У раёне і па сённяшні дзень яшчэ налічваецца звыш 20 калгасаў, дзе калгаснікі карыстаюцца прысядзібнымі ўчасткамі да аднаго і больш гектараў.

У калгасе «Чырвоная ніва», Буркаўскага сельсавета, каля 20 гаспадарак калгаснікаў мае прысядзібныя ўчасткі ад 0,75 да 1 га. Аналагічныя факты раздутых сядзіб ёсць і ў калгасах «Чырвоная гаспадарка», «Другая пяцігодка» і ў радзе іншых калгасаў раёна.

Нельга сказаць, каб гэтым пытаннем у Брагіне зусім не займаліся, або не ведалі пастановы ЦК УсеКП(б), надрукаванай у «Правде» ад 27 сакавіка 1933 года. Ведалі і займаліся. Але займаліся толькі фармальна, на словах.

У сапраўднасці-ж у Брагіне побач з захаваннем разбухшых сядзіб дапускаецца «нарэзка» новых сядзіб за лік калгаснай зямлі.

Напрыклад, старшыня Брагінскага сельсавета Каплан і былы старшыня РВК тав. Анікейчык засеялі для сябе на калгасным полі бульбу і прытым калгасным насеннем і калгаснымі тонымі.

Такім-жа парадкам адвалі сабе «сядзібу» і такім-жа спосабам засеялі для сябе бульбу ўсе работнікі райгазеты на чале з рэдактарам Файбэрам і рад іншых работнікаў.

Усе гэтыя факты сведчаць аб ганебнай блізарукасці, аб палітычнай слепаце брагінскага кіраўніцтва.

Становіцца ясным, чаму Брагінскі раён яшчэ не закончыў сяўбы азімых і зацягвае капанне бульбы. Аднаасобнікі засеялі 102 проц. кліна, а калгасы толькі — 81 проц. Пшаніцы калгасы засеялі усяго 69,7 проц. Калгасныя многіх калгасаў, замест работы на калгасных палёх, працуюць на сваіх разбухшых прысядзібных участках.

А. Мароз.

ВЫНІКІ САЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХ. ВОБЛАСЦЮ НА 5 КАСТРЫЧНІКА 1933 г

	БССР проц.	ЗАХ. ВОБЛ. проц.
ЗАСЕЯНА АЗІМЫХ	92,3	98,0
У ТЫМ ЛІКУ ПШАНІЦЫ	85,6	91,6
ЗАЗЯБЛЕНА	19,8	18,3
ПАДНЯТА ЦАЛІНЫ	28,1	2,2
ВЫБРАНА БУЛЬБЫ	40,6	40,0
АДГРУЖАНА ЛЕНІНГРАДУ	42,1	34,3
ЗЖАТА ЗБОЖЖАВЫХ	95,4	98,9
АБМАЛОЧАНА	52,6	66,1
ВЫЦЕРАБЛЕНА ІЛЬНУ	99,3	99,5
АБМАЛОЧАНА ІЛЬНУ	91,9	—
РАЗАСЛАНА І ЗАМОЧАНА	87,2	96,2
ПАДНЯТА СА СЦЕЛІШЧ	23,2	35,0
ЗАГАТОУЛЕНА ІЛЬНАСЕМЯ	35,4	52,6
ЗАГАТОУЛЕНА ІЛЬНАВАЛАКНА	3,5	—
ЗАГАТОУЛЕНА КАНАПЕЛЬ	3,1	4,9
ЗАСІЛАСАВАНА	59,0	67,1
ГАДАВЫ ПЛАН ЗБОЖЖАПАСТАВАК	61,3	65,5

ЗЛАЧЫННАЕ ЗМЯНШЭННЕ НОРМ ВЫСЕВА

КУЛАЦКАЯ РЭГЛАМЕНТАЦЫЯ РАБОЧАГА ДНЯ

ТУРАЎ.

Дзве лічбы характарызуюць ход сяўбы ў раёне. На 5-та кастрычніка засеяна толькі 78,4 проц. азімага кліна, у тым ліку азімай пшаніцы 74,5 проц.

Спачатку ў раёне гаварылі, што «з-за дажджлівага падвор'я нельга разгортваць сяўбу». Потым цэлыя два тыдні стаяла выключна добрае падвор'е, але тэмпы сяўбы не павышаюцца.

Дрэнная арганізацыя працы і недапушчальная слабасць працоўнай дысцыпліны — вось у чым прычыны. Рэдка ў якім калгасе працуюць больш 6-7 гадзін. У калгасе «Чырвоны басц», напрыклад, выходзяць на работу толькі ў 11 гадзін. Абедзены перапынак цягнецца 4 гадзіны. На полі працуюць не больш 4-5 гадзін.

У калгасе «Прагрэс» выходзяць на работу таксама ў 11 гадзін. Калгас «Наварце» пачынае сяўбу ў поўдзень.

Раённыя-ж арганізацыі — нуль увагі.

Тураў адзначаецца не толькі ганебнейшымі тэмпамі сяўбы. На вачах раённых арганізацый злачынна парушаюцца аграправілы.

Калгас «Прагрэс» змяншае нормы высева, высяваючы на гектар толькі 1,2 цэнтн. Радковая сеялка зусім не выкарыстоўваецца.

У Рычаўскім калгасе на адзін га высяваюць усяго 1 цэнтнер.

У Вярэйцкім калгасе ўжо пяты год сеюць жыта па жыццёвічы, а сёлета на гэтае поле нават і пяню не паклалі.

У калгасе «Перамога» сеюць недобраякасным, напалову заомечаным насеннем.

А раённае кіраўніцтва спакойна праходзіць міма ўсіх гэтых агіднейшых фактаў.

Р.

У ПАГОНІ ЗА „ПРОЦАНТАМ"

Намеснік старшыні Ментарсовета тав. **ТУРЭЦКІ,** прыехаўшы ў Астрашыцка-гарадзецкі сельсавет, выклікаў да сябе старшынь калгасаў імя Сталіна, «Прамень социялізма», «Зара» і іншых і заявіў ім, што трэба павезці ў Менск у лік паставак 40 тон аўса, дадаўшы пры гэтым:

— Няважна, калі ён будзе вільготнасцю і больш 18 проц

Старшыня калгаса імя Сталіна тав. **МАШОК** указаў, што нельга здаваць сыры, нізкакласны авёс, але т. Турэцкі катэгарычна заявіў:

— Не ваша справа — прымуць.

Прывезенае ў Менск калгаснікамі збожжа не было прынята. Тады тав. Турэцкі загадаў везці яго на склад № 1, а калі і загадчык склада № 1 тав. **БАЎДЗЕЙ** адмовіўся прымаць сырое збожжа, Турэцкі праз загадчыка тэхбазы **БРАНШТЭЙНА** тэлефанаграмай загадаў прыняць сырое збожжа. Загад Турэцкага быў выканан.

Ад калгаса імя Сталіна, напрыклад, прынята 7 тон сырога, нізкаякаснага аўса, прычым здача зацягнулася на 5 сутак.

Саўгасам Навелічы здана 7,6 тоны пшаніцы вільготнасцю ў 24 проц.

Па дырэктывах т. Турэцкага было таксама прывезена на склады 40 тон ячменю з вялікай вільготнасцю.

Турэцкі ў пагоні за «процантам» выканання плана збожжапаставак не лічыцца з якасцю здаваемага збожжа. (БЕЛТА).

ПЕРАДАВІКІ ЗБОЖЖАПАСТАВАК

Раён	Процант выканання гадавога плана	Раён	Процант выканання гадавога плана
КАМАРЫНСКІ	93,8	РАГАЧОЎСКІ	85,7
ВЕТКАЎСКІ	86,9	БАРЫСАЎСКІ	85,2

ЧОРНАЯ ДОШКА

ГАРАДОЦКІ	31,5	АСВЕЙСКІ	39,6
ДУБРОВЕНСКІ	32,5	РАСОНСКІ	39,2
ЛЁЗНЕНСКІ	33,1	СУРАЖСКІ	39,5
СІРОЦІНСКІ	35,4	УШАЦКІ	39,5
ЗАСЛАЎСКІ	38,5		

САЎГАСЫ

ЛУГТРЭСТ	8,5	(дырэктар КЛІМАЎ)
НАСЕНТРЭСТ	43,9	(дырэктар АНДРЭЕНКА)
САДАГАРОДТРЭСТ	46,2	(дырэктар САМОХІН)
ПТУШКАТРЭСТ	69,7	(дырэктар КАРАЛЕЎ)
МАГІЛЕЎСКІ СВІНАВОДТРЭСТ	77,8	(дырэктар СТРЫГО)
МЕНМАЛАКАПРАМТРЭСТ	79,5	(дырэктар СЦЯПАНАЎ)

ЗА МЯЖОЙ

АГІДНАСЦІ МАНЧЖУРСКІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ НА КУЧ НЕ СПЫНЯЮЦЦА

ХАБАРАЎСК, 8. (БЕЛТА).

Манчжурскія самазваныя «паменскі» арыштаваных совецкіх адказных агентаў КУЧ не спыняюць агіднасцей.

6-та кастрычніка паліцыя ўзламала дзверы апламатанага габінета арыштаванага харбінскай паліцыяй начальніка рахункова - фінансавай службы КУЧ тав. Кублі, матывуючы неабходнасцю заняць гэты габінет для манчжурскага памочніка тав. Кублі.

Манчжурская частка патрабуе назначыць гэтага памочніка на пасаду начальніка службы. Каля дзвярэй габінета пасля ўзлома пячатак устаноўлен паліцэйскі пост.

Кіраўнік КУЧ тав. Руды прадставіў у праўленне КУЧ даклад аб узломе, патрабуючы прыняцця мер супроць гвалтаў паліцыі, якія парушаюць нармальную работу кіраўніцтва дарогі.

НЕЗАКОННЫЯ ПРЭТЭНЗІІ МАНЧЖУРСКАГА ПАМОЧНІКА КІРАЎНІКА КУЧ

ХАБАРАЎСК, 8. (БЕЛТА).

На пасяджэнні рады кіраўніцтва КУЧ 6-та кастрычніка манчжурскі памочнік кіраўніка дарогі Чжан Мінь-чжэ прадзявіў старшыні рады кіраўніцтва тав. Талстову ультыматыўныя патрабаванні прызнаць членамі рады манчжурскіх [illegible]нікаў, незаконна выключаных [illegible]ды арыштаваных совецкіх [illegible] служб Кублі і Калины.

У адказ на ўказанне тав. Талстога, што склад рады кіраўніцтва рэгламентуецца пэўнымі палажэннямі, і што рада не ў кампетэнцыі абмяркоўваць персанальныя назначэнні, правадзімыя толькі кіраўніком дарогі — манчжурскія члены рады дэманстрацыйна пакінулі пасяджэнне, якое з-за адсутнасці кворума было сарвана.

Манчжурскія ўлады ўхіляюцца ад адказа аб прычынах арышта совецкіх агентаў КУЧ

ХАБАРАЎСК, 9. (БЕЛТА).

Генеральны консул СССР у Харбіне тав. Славуцкі паведаў агента мясцовага дыпламатычнага бюро Манчжоў-Го Шы Люй-беня і патрабаваў ад яго адказа на свой папярэдні пратэст па пводу адсутнасці фармулявання пунктаў абвінавачання, на якіх зроблены арышты 6 совецкіх агентаў КУЧ.

Шы Люй-бень абмежаваўся заявай, што арыштаваныя «выкліканы да пракурора для допыта», і ў сучасны момант вядзецца следства па падазрэнні іх у «злачынствах на службе».

Тав. Славуцкі настойваў на неадкладным вызваленні арыштаваных і спынненні парушэння дагавораў з боку манчжурскіх улад, папярэдзіўшы Шы Люй-беня аб выключнай адказнасці, якая падае на манчжурскі ўрад.

Шы Люй-бень прабаваў быў адхіліць пратэст, аднак, пасля паўторнага настаяння тав. Славуцкага, заявіў, што ён перадасць манчжурскаму ўраду абвінавачанні, на якіх зроблены 6 совецкіх агентаў КУЧ.

Адначасова Шы Люй-бень у адказ на патрабаванне тав. Славуцкага паведаць арыштаваных для азнаямлення з умовамі іх трымання — паведаміў, што з прычыны таго, што следства не скончана, улады ў дазволе паведаць арыштаваных адмаўляюць.

Манчжурская паліцыя дэзарганізуе работу КУЧ

ЧЫТА, 9. (БЕЛТА).

Паліцыя на станцыі Манчжурыя ўсімі спосабамі перашкаджае нармальнай рабоце КУЧ, не дапускаючы гвалтоўна ў памяшканне канторы дэпо назначанага ў законным парадку ч. з. а. начальніка дэпо тав. Левіцкага і награжаючы служачым дэпо рэпрэсіямі ў выпадку невыканання імі распараджэнняў самазванага манчжурскага назначэнца, прысвоіўшага сабе функцыі начальніка дэпо, замест арыштаванага совецкага грамадзяніна Сыцепко.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ВЫВАДЫ КАМІСІИ ПА ЧЫСТЦЫ РЭАЛІЗАВАЦЬ У ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ

ХОД ЧЫСТКІ МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б

У МЕНСКУ НА 8 КАСТРЫЧНІКА ЧЫСТКА АДБЫВАЕЦЦА У 20 ПАРТКАЛЕКТЫВАХ, СЯРОД ІХ ПАРТКАЛЕКТЫВЫ НАРКАМАСВЕТЫ, НАРКАМЗЕМА, БЕЛКААПСАЮЗА, БЕЛДЗЯРЖСНАБА, ГАЛОЎДАРТРАНСА, ГУТЫ «ПРОЛЕТАРЫЙ»; У НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ—ВКСГШ, БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ, ЭНЕРГІНСТЫТУТ І ІНШ.

ПРАВЕРКА ПАРТЫЙЦАЎ СКОНЧАНА У 185 ЯЧЭЙКАХ. УСЯГО ЧЫСТКАЙ АХОПЛЕНА 205 ЯЧЭЕК. ПА МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЧЫСТКУ ПРАЙШЛІ ПА 8 КАСТРЫЧНІКА 6.571 ЧАЛ. — 64,9 ПРОЦ.

МЕНСКАЯ ГАРКАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

СЛОВЫ І ФАКТЫ

(Партарганізацыя Аршанскага паравознага дэпо пасля чысткі партыі)

ОРША, (ваш кар.). Аршанскае паравознае дэпо ў свой час за ўзорную работу атрымала чырвоны сцяг і мармуровую дошку гонару.

У свой час... Не так даўно. 2-3 месяцы таму назад. А як-жа зараз чырвонаштандартнае дэпо апраўдвае гэту ганаровую назву? Як комуністы дэпо змагаюцца за здаровы паравоз? Як яны выконваюць тыя мерапрыемствы, якія былі вызначаны камісіяй па чысткі партыі?

На гэта пытанне сакратар парткалектыва дэпо т. **Мартусевіч** дае вельмі аптымістычны адказ.

— На рабоце паравознікаў перавозкі затрымак не ведалі-б... З нашага боку зроблена ўсё. Паўторных рамонтаў няма, прастояў па нашай віне няма, паказальнікі з кожным днём паляпшаюцца. Усё зло—у рабоце аддзела матэрыяльнага снабжэння, у рабоце дыспетчарскай групы...

Правільна. Дрэнна, вельмі дрэнна працуе аддзел снабжэння, не забяспечвае ён паравозы добрай сумессю вугалі. У рабоце дыспетчарскай групы таксама шмат непаладак. Але...

Адна справа—словы Мартусевіча, а другая справа факты. Калі ў ліпені былі 4 выпадкі паўторнага рамонта, то ў жніўні іх стала 17. Зараз паравозы прастойваюць на прамыўцы па 8-10 гадзін звыш нормы. Малыні сты не лічаць патробным прысутнічаць на прамыўцы, не правяраюць якасці рамонта. У дэпо за апошні час пачало папаваць «галавакружэнне ад поспехаў», а разам з ім беспрытульнасць паравозаў. Днямі быў выпадак (і не адзін), калі ў дэпо «раздзелі» машыну Щ 50-85, выпялі з яе 8 каласнікоў. Назаўтра ўначы брыгада лёгкай кавалерыі на вачах у дзяжурнага па дэпо **Сенчыла** вывезла з дэпо... паравоз. І ніхто нават не падумаў запытаць: куды і хто бярэ машыну.

А куды глядзяць комуністы, што робіць партарганізацыя дэпо?

Самалюбаваннем, самазаспакаеннем, «очковтирательством» займаюцца людзі, толькі не тым, чым патрэбна.

Комуніст **Бакуленка** (машыніст) на Віцебскай дарозе стварыў «пробку», затрымаў рух цягнікоў з бульбай і збожжам. Комуніст **Шмакаў** на работу прыйшоў п'яны. У спісах ударнікаў лічыцца толькі 50 проц. членаў і кандыдатаў партыі. Комсамольцаў толькі 25 проц. ад агульнага ліку арганізацыі. Прычым гэта толькі па спісах, а па справе:

— Хто яго ведае...

У дэпо мае месца грубае апашлен не соцыялістычнага спаборніцтва. У парткалектыве і МК ёсць дзесяткі росных тыпаў—для паравознікаў, для рэмонтных брыгад, для груп і адзіночак—стандартных друкаваных «дагавораў», якія падносяцца рабочым «на подпіс». У гэтых дагаворах ёсць нават такія пункты, як «даць за квартал не менш 5-ці рацыяналізатарскіх прапаноў», для ўсіх аднолькавыя «прадугледжаныя» паказальнікі і г. д.

А ў парткалектыве хвалімся, што ў дэпо вялікі ахоп соцспаборніцтвам...

Некалькі слоў аб выхаваўчай рабоце сярод комуністаў. У часе чысткі партыі было выяўлена, што каля 50 проц. членаў і кандыдатаў партыі кепска адказвалі нават на самыя элементарныя палітычныя пытанні. 13 членаў партыі пераведзены ў кандыдаты, а каля 15 кандыдатаў—у спачуваючыя.

Што зрабіла бюро парткалектыва для таго, каб узняць палітычны ўзровень арганізацыі, каб даць матчымасць пераведзеным ударнікам стаць сапраўднымі, класава-свядомымі і па літычна-пісьменнымі членамі партыі?

Мала. Вельмі мала. Партыйныя ячэйкі дэпо патрацілі больш двух тыдняў (з 15 верасня па 1 кастрычніка) па «падрыхтоўку» да вучобы. Толькі зараз пачаліся заняткі ў партыйных і кандыдацкіх школах. І не гледзячы на такую доўгую падрыхтоўку, наведванне школ нізкае—70-80 проц. За два месяцы пасля чысткі амаль нічога не зроблена па арганізацыі і выхаванні спачуваючых. І гэта пры той умове, што пры парткалектыве ёсць аслабонёны культпроп (т. **Машко**).

Вось што крыецца за ўра-самахвальскім адказам сакратара парткалектыва.

Як відаць, не зразумелі, ці не хацелі зразумець кіраўнікі партарганізацыі дэпо ўрокаў чысткі партыі. А зразумець трэба. І чым хутчэй—тым лепш.

Віт. Даль.

Эстафета імя XV-годдзя УсеЛКСМ

12 кастрычніка ў Віцебску адбудзецца фініш куставой эстафеты імя XV-ці-годдзя УсеЛКСМ.

У Віцебск прыбудуць каманды з Бешанковіч, Лёзны, Гарадка, Горак, а так сама 7 сельсоветаў Віцебскага раёна. Гэтыя каманды прынясуць рапарты аб стане работы па цэрабленню ільну, ства рэнню брыгад «ДІП'а» і першапачатковай апрацоўцы ільну.

Ільнапрадзільная фабрыка «Дзвіна» ўключылася ў эстафету па маршруту за якасць апрацоўкі ільну.

Заводы «Чырвоны металіст», «Комінтэрн», акцыярная фабрыка прымаюць удзел у маршруце за соцыялістычную арганізацыю працы.

Рабочыя трамвая рыхтуюць падарунак да XV-годдзя — датэрміновае скончанне шырокакалейнай лініі. Трамвайнае дэпо выпускае з рамонта звыш плана 1 вагон.

Шчацінны камбінат і трыкатажная фабрыкі імя Клары Цэткін і імя КІМ уключыліся ў маршрут за асваенне тэхнікі новых машын.

Пасля фініша куставой эстафеты з Віцебска на Менск выйдзе зборная каманда ў складзе 11 чалавек, якая панясе рапарты віцебскіх арганізацый і будзе па дарозе праводзіць грамадска-палітычную работу вакол лозунгаў XV-годдзя УсеЛКСМ.

Узмацнілі партыйнае кіраўніцтва калгасамі

З першых дзён работы палітаддзел Танежыцкай МТС у Чырвонаслабодскім раёне суспроўся з радам цяжкасцяй. Многія калгасы былі засмечаны кулацкімі элементамі, якія прабавалі скарыстаць дробна-ўласніцкія традыцыі многіх калгаснікаў у сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах. Калгасны актыў не быў арганізаван. Партыйныя і комсамольскія сілы ў калгасах былі нязначныя і дрэнна расстаўленыя.

Да пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгаснай ячэйцы ў раёне дзейнасці Танежыцкай МТС было 12 тарытарыяльных партыйных ячэек, у склад якіх уваходзіла 224 члены і кандыдаты партыі. Калгаснай ячэйкі не было ні адной.

Пасля перабудовы партарганізацыі створаны 3 партыйныя калгасныя ячэйкі, 3 кандыдацкія групы і 5 партыйна-комсамольскіх ядраў. У 35-ці калгасах вылучаны партыйныя арганізатары, з якіх 10 працуе непасрэдна ў калгасах і 25 прымацаваны з раённага партыйнага актыва.

Пасля чысткі ў партыйнай арганізацыі засталося 185 членаў і кандыдатаў партыі. 8 кандыдатаў пераведзены ў часе чысткі ў спачуваючыя. Усіх комуністаў, працуючых у калгасах на вытворчасці—40 чалавек, з якіх непасрэдна ў брыгадах 10 чалавек.

Не гледзячы на значнае змяншэнне, партыйная арганізацыя пасля чысткі стала больш моцнай, больш баяздольнай і аўтарытэтнай.

У раёне дзейнасці МТС ёсць 47 калгасаў, якія разбіты на 105 паляводчых брыгад. Такім чынам, на кожны калгас не выпадае нават і аднаго комуніста. Правільная расстаноўка партыйных сіл у гэтых умовах мае асабліва важнае значэнне. У сувязі з малалікасцю партарганізацыі мы не мелі матчымасці ахапіць поўнасцю ўсе калгасы партыйным кіраўніцтвам. Прышлося арганізаваць партыйныя ячэйкі, кандыдацкія групы і парткомсамольскія ядры ў найбольш буйных і рашаючых калгасах, а ў меншых калгасах вылучаны партарганізатары.

Арганізацыйнае афармленне ў асноўным закончана. Калі-як узяць перабудову метадаў самой работы, то гэты працэс толькі пачаўся. Палітаддзел аддаваў шмат увагі кіраўніцтву партыйнымі ячэйкамі, кандыдацкімі групамі, парт. комсамольскімі ядрамі і асабліва комуністамі-адзіночкамі. З сакратарамі парт'ячэек, кіраўнікамі кандыдацкіх груп і комсамольскіх ядраў сістэматычна праводзяцца нарады. Праведзен таксама адзін агульны раённы сход комуністаў, працуючых у калгасах. Да комуністаў-адзіночак часта выязджаюць работнікі палітаддзела, праводзяць інструктаж і аказваюць ім практычную дапамогу ў рабоце.

Трэба сказаць, што працаваць па-новаму, займацца па-сапраўднаму вытворчымі пытаннямі, стварыць вакол сябе актыў з калгаснікаў-ударнікаў—гэтаму навучыліся далёка не ўсе партыйныя звенні. Аднак, некаторыя ёсці ў гэтай галіне мы маем. Пасля чысткі калгасы дабіліся значных рэзультатаў у сувязі з перабудовай парпработы. Так, калгасы «Шлях Леніна», імя Сталіна і «Прамень» выйшлі ў рады перадавых. Партячэйкі і кандыдацкія групы ў гэтых калгасах пачалі спапраўды працаваць па-новаму. Комуністы ўсвядомілі стаячыя перад імі задачы. Гэтыя калгасы добра справіліся з уборкай і правядзеннем сяўбы. Да 26 верасня яны поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах загатовак і па натураплаце МТС.

Пасля перабудовы партработы комуністы пачалі больш глыбока ўваходзіць у працэс вытворчасці, у арганізацыю працы, пачалі арганізоўваць вакол сябе калгасны актыў і працаваць па плану. Характэрныя прыклады ў гэтых адносінах можна прывесці з практыкі калгаса «Шлях Леніна». Там комуністы і комсамольцы паказалі сапраўды большавіцкія ўзоры работы. У гэтым калгасе ў самы разгар сельгас работ арганізавана партыйна-комсамольскае ядро, а потым ячэйка.

Калгас быў пад пагрозай развала. Пратэзныя ў яго кулакі ў часе веснавога прыліва, карыстаючыся арганізацыйнай слабасцю калгаса, прабавалі развяліць яго ў часе ўборачнай кампаніі. Даходзіла да таго, што паасобныя калгаснікі і новаўступіўшыя пачалі самавольна забіраць з поля снопы. Партыйна-комсамольскае ядро пачало весці ўпартую растлумачальную работу сярод калгаснікаў і разам з тым выяўляць класава-чужыя элементы. У рэзультаце праведзенай работы выяўлена 6 кулакоў, якія былі выключаны з калгаса. Побач з гэтым партыйна-комсамольскае ядро вяло штодзённую настойлівую работу па арганізацыі вакол сябе калгаснага актыва. На сённяшні дзень у калгасе арганізавана група актыва ў колькасці 30 чалавек, з якімі праведзены ўжо чатыры нарады па пытаннях бягучых работ.

Брыгады і звенні спаборнічаюць паміж сабой. У брыгадах праводзяцца чыткі газет, выпускаюцца брыгадныя газеты. Усе гэтыя мерапрыемствы спрыялі таму, што калгас з адстаючых вышаў у перадавыя па ўсіх паказальніках.

Вялікую работу па ўмацаванні працдысцыпліны правяла ячэйка **калгаса імя Войкава.** Асабліва трэба адзначыць дасягненні ў рабоце СТФ гэтага калгаса. На свінаферме адыход дахадзіў да 30-40 проц. Калі ячэйка пачала кіраваць вытворчасцю, адыход свіней даведзен да нуля. Вялікую заслугу ў гэтым трэба аддаць заг. фермай тав. **Фейнбіну** (ён-жа сакратар парт'ячэйкі), які дабіўся такіх рэзультатаў у выніку большавіцкай барацьбы за якасць догляда свіней.

Нядрэнныя ўзоры работы паказала партыйная ячэйка **калгаса «Перамога».** Ячэйка арганізавала вакол сябе калгасны актыў з лепшых ударнікаў у колькасці 37 чалавек, з якім вядзе штодзённую работу.

У калгасах МТС арганізавана 150 чалавек калгаснага актыва, які з'яўляецца моцнай апорай у рабоце партыйна-комсамольскай арганізацыі. Пры да намозе калгаснага актыва, ячэйкі дабіліся добрай арганізацыі працы і высокай дысцыпліны ў калгасах. Партыйныя ячэйкі пачалі глыбока ўваходзіць у калгасную вытворчасць, пачалі кіраваць не наогул, а канкрэтна. Усё гэта безумоўна ўзмацніла партыйны ўплыў у калгасах і дало магчымасць Чырвонаслабодскаму раёну выйсці на адно з першых месц у БССР па правядзенні ўборкі і сяўбы.

Аднак, побач са станоўчымі рэзультатамі нельга не адзначыць і тых адмоўных момантаў, якія мы маем у рабоце.

Некаторыя партыйныя звенні, як, напрыклад, парткомсамольскае ядро ў калгасе «Мейскі прамень» і кандыдацкая група ў калгасе «Новы шлях» працуюць па-старому. Кандыдацкая група ў «Новым шляху» арганізавана з месяца назад, а работа па-новаму фактычна не пачалася. Адсюль як вынік калгас увесь час знаходзіцца ў глыбокім прарыве па ўсіх сельгасработах.

Ёсць выпадкі супраціўлення паасобных комуністаў перабудове партработы і простае адмаўленне працаваць у брыгадзе (кандыдат партыі **Купябко**—калгас «Новы шлях» і кандыдат партыі **Гапоўка** калгас «Дук»). Мы маем таксама і недаацэнку перабудовы партработы з боку некаторых раённых работнікаў. З вылучаных райкомам партыі 25 партарганізатараў фактычна працуе толькі 7. Райком партыі да гэтага часу ніякіх мер не ўжыў. Некаторыя сакратары тарытарыяльных ячэек адмовіліся аказваць якую-б там ні было дапамогу калгасам. Ёсць выпадкі, што комуністы, працуючыя ў калгасах, маюць тэндэнцыю замяшчацца ў сваю ўласную шкарлупу (Бучагінская ячэйка).

У цяперашні час палітаддзел сумесна з райкомам разгарнуў шырокую работу па падрыхтоўцы да пачатку зімовай парткурсы. Распрацавана сетка партасветы і падабраны кіраўнікі. Для замацавання работы ў новаарганізаваных звеннях палітаддзел намеціў правесці з 1 лістапада месячныя курсы сакратароў парт'ячэек, кіраўнікоў кандыдацкіх груп і партыйна-комсамольскіх ядраў.

У цяперашні час на старонках палітаддзельскай газеты «За большавіцкія тэмпы» арганізован абмен вопытам работы сакратароў ячэек, кандыдацкіх груп і парторгаў з мэтай паказа лепшых прыкладаў работы паасобных таварышоў і перадачы добрага вопыта другім.

Уведзены спецыяльныя палітдні для правядзення канкрэтных пытанняў калгаснай вытворчасці (рамонтаванне ўраджаю, поўнацэннасць прадання, станоўшча жывёлагадоўчых ферм і г. д.).

Перад намі прадстаіць яшчэ вялізарная работа. Пры ўпартай і штодзённай большавіцкай рабоце палітаддзел і райком партыі сумесна з усёй партыйнай арганізацыяй, працоўшай нядаўна чыстку, з гонарам справяцца з тымі задачамі, якія партыя паставіла на даным этапе ў галіне калгаснага будаўніцтва.

Нам. нач. палітаддзела Танежыцкай МТС ПРЫХОДЗЬКО.

Па-баявому падрыхтавацца да канферэнцыі парторгаў

Прайшоўшая па прадпрыемствах **Менска** чыстка партыі ўскрыла зусім нездавальняючае становішча партыйна-масавай работы, асабліва ў нізавых вытворчых звеннях—брыгадах, цэхах. Парторгрупы на радзе фабрык і заводаў лічыліся толькі па паперы, работы-ж яны ніякай не праводзілі.

У часе чысткі ў гэтай галіне намеціўся некаторы зрух, але захапаванне яго праходзіць яўна нездавальняюча і дырэктывы праверачных камісій па чысткі ажыццяўляюцца вельмі слаба. Для таго, каб дабіцца рашучага пералому ў замацаванні рэзультатаў чысткі і ажыццяўленні дырэктыў праверачнай камісіі аб перабудове партыйна-масавай работы, Менскім гаркомам партыі і гарадской камісіяй па чысткі **15 кастрычніка склікаецца гарадская канферэнцыя парторгаў.**

На прадпрыемствах ужо разгортваецца падрыхтоўчая работа паводле плана, выпрацаванага аргінструктарскім аддзелам гаркома партыі. З усіх прадпрыемстваў горада 10 найбольш буйных—гарбарня **«Большэвік»**, завод **імя Варашылава**, фабрыка **«Кастрычнік»** і інш. вызначаны апорнымі, да якіх прымацаваны работнікі гаркома для аказання практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да канферэнцыі.

Апрача агульных пытанняў падрыхтоўкі, гэтыя прадпрыемствы павінны распрацаваць асобныя пытанні работы парторгруп для таго, каб на канферэнцыі абмяняцца станоўчым вопытам перабудовы і перанесці гэты вопыт на ўсе прадпрыемствы.

Пры доме Комасветы арганізавана кансультацыя кіруючых партработнікаў па ўсіх пытаннях, звязаных з перабудовай партыйна-масавай работы. Там-жа штодзённа заслухоўваюцца 10-мінутныя даклады асобных парторгаў апорных прадпрыемстваў, як яны рыхтуюцца да канферэнцыі. На гэтыя даклады прыцягваюцца і парторгі іншых фабрык і заводаў.

Сёння пры гаркоме склікаецца нарада ўсіх парторгаў апорных прадпрыемстваў для падагульнення падрыхтоўкі да канферэнцыі. Трэба адзначыць, што падрыхтоўка па ўсіх без выключэння прадпрыемствах, асабліва на абутковай фабрыцы імя **Кагановіча** і дрэваапрацоўчым заводзе **імя Молатава**, па-сапраўднаму яшчэ не разгарнулася. Гэта асабліва выявілася на нарадзе сакратароў парткалектываў апорных прадпрыемстваў пры гаркоме партыі 8-га кастрычніка. Характэрна, што многія сакратары цэх-парт'ячэек, не гаворачы ўжо аб сакратарах парткалектываў, не ведаюць сваіх парторгаў.

Канферэнцыя парторгаў—важнейшае мерапрыемства, накіраванае на ажыўленне і ўмацаванне работы нізавога партзвяна, а значыць і ўсёй партыйна-масавай работы на прадпрыемствах. Але ўсяго гэтага можна дасягнуць толькі ў тым выпадку, калі партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў па-сапраўднаму разгорнуць падрыхтоўку да канферэнцыі, увязваючы яе з барацьбой за выкананне вытворчых заданняў кожным асобна ўзятым нізавым звяном—брыгадай, цэхам і прадпрыемствам у цэлым.

Лічаныя дні, што засталіся да канферэнцыі, трэба максімальна скарыстаць для ўзорнай падрыхтоўкі, каб канферэнцыю сустрэць станоўчымі рэзультатамі перабудовы работы нізавых партзвенняў.

Ф.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ АСЕННЯ-ЗІМОВАЙ ПАРТВУЧОБЫ

Ліст культпропа ЦК КП(б)Б усім гаркомам і райкомам КП(б)Б, палітаддзелам МТС і саўгасаў

Работу масавай сеткі партасветы ў надыходзячы асенняя-зімовы перыяд, арганізаваць на падставе глыбокага вывучэння ўрокаў чысткі партарганізацый, першыя вынікі якой ужо сведчаць аб незадавальняючым кіраўніцтве марксіцка-ленінскім выхаваннем з боку роду партарганізацый.

Асноўнай задачай партарганізацый на партасвеце павінна быць глыбокае вывучэнне арганізацыйных прынцыпаў большэвізма, праграм партыі, гісторыі УсеКП(б) і КП(б)Б, асноўных пытанняў ленінізма і ленінскай палітыкі нашай партыі. На падставе ўмілай вучобы з практычнымі мерапрыемствамі партарганізацыі павінны дабіцца глыбокага разумення партыйнымі масамі асноўных пытанняў палітыкі партыі, разумення задач, што стаяць перад кожнай партарганізацыяй і ўмення звязваць іх з агульна-партыйнымі задачамі. Павышэнне ідэалагічнага ўзроўня членаў і кандыдатаў партыі павінна дапамагаць барацьбе за якасць работы, за ўдарную працу на вытворчасці, за авангардную ролю комуніста.

Асноўнымі формамі партасветы з'яўляюцца:

1) Кандыдацкія школы, працуючыя па падручніку **Інгулава** або **Воліна** ў горадзе і **Корпінскага** на вёсцы. Кандыдацкія школы арганізуюцца пры цэхавых і зменных ячэйках у калгасных, саўгасных брыгадах для кандыдатаў партыі і спачуваючых. Кандыдаты, не маючыя ведаў у аб'ёме кандыдацкай школы, і спачуваючыя наведваюць школу ў абавязковым парадку.

2) Пачатковыя школы па ленінізму, працуючыя па кнізе **Сталіна «Об основах ленинизма».**

3) 8 месячныя вяч. саўпартшколы для нізавога актыва.

4) Марксіцка-ленінскія гурткі для актыва па асобных дысцыплінах (культпроп ЦК зварачае асаблівую ўвагу на арганізацыю гурткоў па гісторыі партыі, па ленінізму, па вывучэнні асобных выданняў **Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна).**

5) Дэкадныя семінары райпартактыва і актыва прадпрыемстваў, працуючыя над асобнымі тэмамі марксізма-ленінізма.

6) Комвуз сакратароў цэх'ячэек, працуючы з дні ў месяц з вызваленнем ад работы.

7) Вячэрнія комвузы пры **Менскім, Гомельскім, Віцебскім, Магілеўскім, Бабруйскім, Рэчыцкім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Аршанскім, Лепельскім, Полацкім, Мазырскім, Пятрыкаўскім, Клімавіцкім** гаррайкомах КП(б)Б з філіяламі на буйных прадпрыемствах.

На буйных прадпрыемствах і пры палітаддзелах МТС і саўгасаў арганізаваць агітпропбагінеты, у якіх скаляцентраваць індывідуальную і групавую кансультацыю і работу семінараў парт актыва і прапагандыстаў.

Работу па камплектаванні сеткі партасветы праводзіць, лічачыся з вытворча-бытавымі і тэрытарыяльнымі ўмовамі і палітычнай пісьменнасцю кожнага члена і кандыдата партыі. Пры правядзенні камплектавання ў тыя або іншыя формы партасветы трэба ўлічваць меркаванні камісіі па чысткі данай арганізацыі.

Асаблівую ўвагу РК і парткалектывы павінны аддаць пытанню арганізацыі партвучобы ў зменах, у брыгадах і з асобнымі комуністамі, якія не могуць быць ахоплены школамі.

У камплектуемую сетку партасветы неабходна прыцягваць комсамольскі і беспартыйны актыў, паралельна арганізуючы сетку палітшкол і гурткоў для беспартыйных рабочых, калгаснікаў, у якіх практыкаваць чытку газет, правядзенне важнейшых пастаноў партыі і ўрада і пытанняў тэх. і агрэмінімума.

Для актыва неабходна шырока выкарыстаць апрацаўваючую сябе форму дакладаў на пытаннях гісторыі партыі, праграму і статут партыі і Комінтэрна і па асобных пытаннях ленінізма.

Партарганізацыі павінны дабіцца на працягу асенняя-зімовага перыяда правядзення ўсёй палкам праграмы школы (гуртка), увязваючы пытанні практычнай работы з правядзеннем праграмамі.

* * *

Асаблівую ўвагу РК і палітаддзелы павінны аддаць пытанню падбора і праверкі прапагандысцкіх кадраў. Да пачатку работы школ і гурткоў неабходна на дасканала праверыць склад усіх правядзенцаў для работы ў школах і гурткі прапагандыстаў, зацверджаных РК, або палітаддзеламі. Вылучаных прапагандыстаў замацаваць на ўвесь асенняя-зімовы перыяд. Прапагандыстаў, годных для правяроўкі, але пераклі... РК на іншую работу, звярнуць за... на правяроўку (пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 20-V—33г.).

Усіх прапагандыстаў прымацаваць для пастаяннай работы да семінараў, працуючых у строга вызначаны дні в тым, каб кожная, падлягаючая правяроўцы ў школе тэма, была папярэдня правяроўвана прапагандыстамі ў семінары.

Выкладчыкаў ВНУ, тэхнікумаў і сярэдніх школ, а таксама кіруючы партактыў прыцягнуць для работы ў масавай сеткі партасветы, у першую чаргу ў кандыдацкіх школах і пачатковых школах ленінізма.

У масавай сеткі партасветы ўстанавіць наступную колькасць дзён вучобы:

1) у кандыдацкіх школах, пачатковых школах ленінізма і марксіцка-ленінскіх гуртках — 5-6 дзён, у ВСШП — 8 дзён, у вяч. комвузах — 12 дзён у месяц;

2) семінары партактыва, заняткі комвуза, сакратароў ячэек і канферэнцыі адзіночак комуністаў праводзіць менш 3-х раз у месяц.

Культпроп ЦК прапануе арганізаваць сістэматычную праверку работы школ і дапамогі ім з боку партарганізацый і палітаддзелаў, шляхам наведвання школ і інструктавання іх, шляхам... станоўкі дакладаў асобных прэп... дыстаў з удзелам слухачоў на бю... парткомаў, райкомаў і ячэек, шляхам сістэматычнага асвятлення хода вучобы ў школах, у мясцовым друку. ... мым рашучым чынам змагацца супр... зрываў заняткаў, змагацца за ўзорную... сапраўды вучэбную работу школ, а... дысцыпліну ў школе, за адказнасць прапагандыста і слухача за вучобу, ... добрае ўсваенне праграмаванага ... тэрыяла.

У сеткі партасветы арганізаваць ... цыялістычнае спаборніцтва як пам... слухачамі ўнутры школ, так і паміж школамі, паяроўваючы яго на барацьбу за лепшую школу, за лепшага слухача, за лепшага прапагандыста.

За лепшыя паказальнікі ў марксіцка-ленінскай вучобе прэміраваць школы і асобных слухачоў творамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, запасіцамі адзначаемымі пастановамі на чырвоную дошку і г. д. Мясцовыя газеты павінны даваць на сваіх старонках месца лепшым ударнікам вучобы, паказваючы работу ў школах, стымулюючы перакананне вопыта лепшых школ. Паспяхова кончаючым школы выдаць адпаведныя дакументы, якія павінны характарызаваць іх адносіны да вучобы і асваенне праграмы.

Побач з разгортваннем сеткі партасветы, неабходна аказаць дапамогу комсамольскім арганізацыям у разгортванні сеткі комсамольскай палітаддзелы, вылучыць для яе прапагандыстаў, набыць падручнікі, падшукаць памяшканні, забяспечыўшы сістэматычны інструктаж прапагандыстаў, а калі гэта неабходна і ўключыць прапагандыстаў у адпаведныя семінары.

Заг. культпропам ЦК КП(б)Б ТАМАРКІН.

ГАЛОЎНЫЯ ПЫТАННІ АБХОДЗЯЦЬ МАЎЧАННЕМ

(НА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЙКІ НАРКАМАСВЕТЫ)

Л. НІХАМКІН І В. ЗАЙЦАЎ

Прайшло ўжо больш паўгода пасля пастановы ЦК КП(б)Б па Наркамасвеце. І зараз на чысткі ячэйкі, кожны комуніст — работнік Наркамата трымае адказ перад партыяй аб тым, як ён у сваёй практычнай рабоце ажыццяўляў рашэнне ЦК КП(б)Б, як ён выпраўляў і выпраўляе дапушчаныя скажэнні нац палітыкі партыі, як ён дапамагаў новаму кіраўніцтву спраўляцца з ускладненымі на яго задачамі.

Трэба сказаць, што ячэйка наркамасветы прышла да чысткі з далёка незадавальняючымі рэзультатамі. І таму, калі камісія патрабуе ад праходзячага чыстку паказаць канкрэтныя справы ў ажыццяўленні дырэктыў ЦК партыі, то большасць старацца ўхіліцца ад простага адказа, прыкрываючыся агульнымі разважаннямі.

Характэрным з'яўляецца тое, што большасць комуністаў, нават тыя, якія працуюць у наркамаце па некалькі гадоў, стараюцца абысці ці толькі лёгка закрануць тыя прарывы, якія былі ў наркамаце. Амаль усе спыняюцца толькі на адным сваім участку, складаючы з сябе адказнасць за работу партыйнай ячэйкі і наркамата ў цэлым. Аб гэтым прыходзіцца камісіі напамінаць амаль што кожнаму. І тут пачынаюцца выкручванні: я гаварыў, я падымаў пытанне, я ставіў...

Вось, напрыклад, член партыі **Багушэвіч.** У апараце НК Асветы ён працуе з кастрычніка 1932 года. Незадоўга перад гэтым ён працаваў у Белдзяржвыдавецтве і Камвузе. Зараз ён кіруе спецсектарам, з'яўляецца членам калегіі наркамасветы і членам галоўрэперткома.

Перыяд яго работы ў ДВБ супадае з актыўнай дзейнасцю там беларускіх контрраволюцыйных нацдэмаў Цвікевіча, Шынпіма і інш. Нельга сказаць, каб Багушэвіч вёў у ДВБ сапраўдную большэвіцкую барацьбу з беларускімі нацдэмамі. Дастаткова ўказаць, што 27 жніўня 1929 года на пасяджэнні бюро парт'ячэйкі ДВБ, членам якой быў тав. Багушэвіч, прадстаўнік Фрунзеўскага райкома партыі тав. **Гурэвіч** указаў, што ў свой час, калі ён выступаў на сходзе ячэйкі па пытанні ліста трох пісьменнікаў, то з боку ячэйкі ён належнага падтрымкі не меў.

Хоць гэта і асабліва пастанова ЦК КП(б)Б па наркамасветы, абавязвала Багушэвіча ўзмацніць сваю рэвалюцыйную пільнасць у барацьбе з класава-варожым элементам, накіраваць усе сілы на хутчэйшую перабудову работы наркамата. Багушэвіч, кіруючы спецсектарам, далёка недастаткова змагаўся за ачышчэнне апарата НК асветы ад неправерэных і класава-чужых элементаў.

Гэта-ж факт, што адказным сакратаром рэдакцыі часопісі «Ком. выхаванне» да гэтага часу працуе нехта **Туміловіч**—сын кулака, а сакратарам кадраў кіраваў **Сушчынскі**, які з'яўляецца выхадцам з кулацкай сям'і. Нікому не сакрэт, што на экранах менскага кіно, над носам у Багушэвіча зусім нядаўна дэманстравалася, нават для дзяцей, такая ідэалагічна шкодная фільма, як «Дзяўчына з джунгляў», а на мясцох, сям-там як і раней ставілі яўна нацыяналістычныя рочы, накшталт «Плытагонаў» і інш.

Нацсектар, якім кіруе **Кантаровіч**—з'яўляецца самым адказным участкам у рабоце Наркамасветы. Фактычна скрыўленні нацыянальнай палітыкі партыі іншы ў значнай частцы па лініі гэтага сектара. Школы ў мінулыя гады ды і цяпер яшчэ на многіх мясцох камплектаваліся, выходзячы толькі з нацыянальных адзнак, якраз у разрэз з лініяй партыі ў нацыянальным пытанні: дзіця-яўрэй пасылалі ў абавязковым парадку ў яўрэйскую школу, беларуса—у беларускую, паляка—у польскую, не лічачыся з жаданнем бацькоў, з веданнем дзіцём мовы. Спадчына нацдэмаўшчыны, ігнараванне інтарэсаў расійскай нацыянальнай меншасці не толькі не была ліквідавана, але фактычна засталася. Усім вядома механічнае правядзенне беларусізацыі ў б. Калінінскай акрузе. Там проста былі ліквідаваны ўсе расійскія школы, не гледзячы на тое, што на даных дэматрафічнага пераліса 1926 г. на тэрыторыі Калінінскай акругі было 85.419 чалавек насельніцтва, роднаю мовай, якога з'яўлялася расійская. **Да цяперашняга часу ў раёнах былой Калінінскай акругі няма ні адной рускай школы.**

Кіраўніцтва наймеднаўскімі школамі было пастаўлена ў мінулым і стаіць за раз зусім дрэнна. Расійскімі, украінскімі, нямецкімі школамі фактычна ніхто не кіраваў, дый не адчуваецца гэтага кіраўніцтва і зараз. Польскімі школамі «кіраваў» такі чалавек, як Квяткоўскі (аб ім будзе гутарка ніжэй). А хіба мала фактаў, калі наймеднаўскія школы ў раёнах проста ігнараваліся? Для іх не ствараліся належных матэрыяльных умоў, імі на мясцох ніхто не займаўся, не кантраляваў. Можна прывесці цэлы рад фактаў, калі ў нацменаўскай школе выкладанне ішло на беларускай або расійскай мове. Нацсектар усё гэта ведаў, але глядзеў на грубейшыя скажэнні нацпалітыкі партыі скрозь пальцы.

Як гэта ні дзіўна, але з поля зроку нацсектара выпаў такі адказны ўчастак работы, як палітасветработа сярод нацменаўскага насельніцтва. Гэтаю справай, па словах т. Кантаровіча, павінен быў займацца палітасветсектар, які ў сваю чаргу пакладаўся на нацсектар. А фактаў-жа выплазак нацыяналістычных элементаў (яўрэйскіх, польскіх і інш.) у нацыянальных клубах, хатах-чытальнях, у бібліятэчнай справе мы мелі і маем зусім нямала.

Кантаровіч на чысткі гаварыў аба ўсіх гэтых палітычных прарывах, але больш як набочны глядач, а не як комуніст, пастаўлены партыяй на гэты участак фронта нацыянальна-культурнага будаўніцтва, які нясе за яго адказнасць.

Справа не толькі ў ранейшых памылках. Яшчэ горш тое, што Кантаровіч да гэтага часу не зразумеў сутнасці пастановы ЦК аб Наркамасветы і не зрабіў для сябе з яе палітычных вываўаў. Аб перабудове работы нацсектара і Наркамасветы ў цэлым пакуль толькі шмат, і часта нават самакрытычна, гаворыць, але вельмі мала робяць, каб ад разагавораў перайсці да сапраўднай перабудовы.

Мы лічым агіднейшым фактам поўнае замоўчванне не толькі Кантаровічам, але і ўсімі работнікамі Наркамасветы ў часе чысткі пытання палітэхнізацыі школы.

Вясною гэтага года навукова-даследчым інстытутам комвыхавання праведзілася шырокае абследаванне паста ноўкі палітэхнізацыі ў школах БССР. Матэрыялы абследавання гаворыць аб тым, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб 5 верасня 1931 г. аб пачатковай і сярэдняй школе ў галіне палітэхнізацыі школы **далёка не выканана.** Наркамасветы павінен быў выдаць праграму для настаўнікаў для азнаямлення іх з асновамі вытворчасці. Не гледзячы на патрабаванні настаўніцтва, гэтых праграм да гэтага часу няма. У Наркамасветы не было і зараз няма нават інспектара-метадыста па пытаннях палітэхнізацыі школы. Гэтай справай фактычна ніхто не кіраваў. На прыкладу Наркамасветы, раённыя інструктары метадысты і загадчыкі раёнаў, бываючы ў школах, як правіла, пастано

ВЫКАНАЕМ СВОІ АБАВЯЗАК ПЕРАД ПРОЛЕТАРАМІ ЛЕНІНГРАДА

Выразна манеўраваць вагонным паркам!

БЕСПЕРАПЫННА ПРАСОЎВАЦЬ МАРШРУТЫ З БУЛЬБАЙ У ЛЕНІНГРАД

Да суровай адказнасці за несваячасовы вываз грузаў і прастой вагонаў

1 Яшчэ 5 тыдняў таму назад «Звязда» сігналізавала аб выключна дрэнным рабоце і непадрыхтаванасці Загатзбожжа да прыёмкі і размяшчэння збожжавых грузаў, якія прыбываюць у Менск.

За гэты час становішча амаль не палепшылася, чыгуначныя пакгаузы, дзесяткі вагонаў пераатораны Загатзбожжам у пастаянныя склады. Вагоны сістэматычна затрымліваюцца пад разгрузкай.

На Менскім вузле накапілася ўжо каля 500 вагонаў са збожжам. Заняты ўсе пакгаузы. Запоўнены таксама адкрытыя пляцоўкі. **На пасажырскай станцыі ўжо больш трох тыдняў стаіць 16 вагонаў мукі і каля месяца 8 вагонаў.**

У верасні вывезена з чыгуначных пакгаузаў на гарадскія склады 160 вагонаў, але зараз-жа гэта плошча зноў была занята мукой і вотрубямі. Месца для ссыпкі больш няма.

Прастоі вагонаў набылі сістэматычны характар. 5-га кастрычніка па віне Загатзбожжа **5 вагонаў прастаялі суткі.** Ужо трэція суткі на калёсах прастойваюць 16 вагонаў са збожжавымі грузамі. Загатзбожжа да гэтага часу не можа ўказаць, куды іх разгрузіць.

Амяртвленне вагоннага парка дэзарганізуе ўсю работу менскага вузла.

Як відаць, работнікі Загатзбожжа не адчуваюць адказнасці за працу транспарта.

Пракуратуры неабходна прымусіць Загатзбожжа пачаць планамерны вываз усяго збожжа і мукі з чыгуначных складаў і пакгаузаў, безадкладна разгрузіць вагоны.

Пры своячасовай разгрузцы і вывазцы збожжавых грузаў менскі вузел мог-бы штодзённа даваць для адгрузкі бульбы Ленінграду каля 50 дадатковых вагонаў.

М. К.

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛАН АДГРУЗКІ

1. УЗДЗЕНСКІ РАЁН — АДГРУЗІЎ 1.182 ТОНЫ — 124,5 ПРОЦ.
2. ВІЦЕБСКІ РАЁН — АДПРАВІЎ ЛЕНІНГРАДУ 3.000 ТОН — 111,2 ПРОЦ.
3. ЖЛОБІНСКІ РАЁН — АДГРУЗІЎ 3.850 ТОН БУЛЬБЫ — 102,4 ПРОЦ.
4. ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН — АДГРУЗІЎ 1.849 ТОН — 102,7 ПРОЦ.
5. МЕНСКІ РАЁН — 625 ТОН — 104,2 ПРОЦ.
6. ТАЛАЧЫНСКІ РАЁН — 3.000 ТОН — 103,6 ПРОЦ.

ЗРЫЎЦІЧЫКІ АДГРУЗКІ

1. ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ РАЁН — 11,6 ПРОЦ. ПЛАНА; 2. МСЦІСЛАЎСКІ — 16,8 ПРОЦ.; 3. ПРАПОЙСКІ — 16,4 ПРОЦ.; 4. БЯЛЫНІЦКІ — 17,6 ПРОЦ.; 5. УВАРАВІЦКІ — 19,6 ПРОЦ.; 6. КАПЫЛЬСКІ — 19,5 ПРОЦ.; ЦЕРАХАЎСКІ — 23,3 ПРОЦ.; 7. КРУПСКІ — 25,6 ПРОЦ.; 8. ЛОЕЎСКІ — 26,6 ПРОЦ.; 9. БРАГІНСКІ — 27,7 ПРОЦ.; 10. ЛАГОЙСКІ — 28,7 ПРОЦ.; 11. ЛЮБАНЬСКІ — 27,5 ПРОЦ.; 12. БУДА-КАШАЛЕЎСКІ — 30,3 ПРОЦ.

Падаваць пад бульбу не менш 700 вагонаў

Тэмпы адгрузкі бульбы Ленінграду ўсё яшчэ застаюцца не здавальняючымі. Становішча пагоршваецца тым, што за апошнія дні падача вагонаў рэзка ўпала. За 8 кастрычніка **замест 700 вагонаў падана 478,** за 9 кастрычніка не больш 450.

Маскоўска-Беларуска-Балтыцкая і Заходняя чыгункі штодзённа мяняюць нормы падачы вагонаў, устаноўленыя Саветам працы і абароны і гэтым дэзарыентуюць раёны чыгунак БССР.

9-га кастрычніка начальнік МБВ чыг. прапанаваў Віцебскаму раёну даць для адгрузкі бульбы Ленінграду 100 вагонаў, а начальнік эксплаатацыйнай службы гэтай-жа дарогі **Квіт-ніцкі** распарадзіўся не даваць ні аднаго.

Такое планаванне ўносіць дэзарганізацыю ў нармальную работу вузлоў, ламае графікі адпраўлення маршрутаў.

Ад усіх звеньняў транспарта БССР патрабуецца **мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, правільнае манеўраванне наяўным паражняком,** недапушчэнне прастоя вагонаў пад пагрузкай і разгрузкай ні адной лішняй мінуты.

Трэба ва што-б там ні стала дабіцца, каб дырэктыва партыі і ўрада аб сканчэнні адгрузкі бульбы і гародніны Ленінграду да 25 кастрычніка была своячасова і поўнасцю выканана.

Чаму прастойваюць баржы з бульбай?

ВІЦЕБСК. Перавалачны пункт **Чэпіна** працуе вельмі дрэнна. Прыбыўшыя з Суража, Бешанковіч і інш. раёнаў баржы з бульбай прастойваюць па 5-6 дзён не разгружанымі. На пункце зараз знаходзіцца каля 8 барж з бульбай. Нявыгрузка лайб замарожвае водны транспарт і зрывае выкананне плана перавозак.

Перавалачна-пагрузачныя работы механізаваны. Створаны ўсе ўмовы, каб выгружаць баржы і пагружаць вагоны круглыя суткі без перабояў. Аднак, дрэнная арганізацыя працы і мітусня выклікаюць заторы. На пункце працуе 14 брыгад з 84 чалавек. Людзей як быццам хапае. Ёсць 6 ваганетак, рэйс якіх павінен заняць не больш 15 мінут. Кожная ваганетка ад возіць каля тоны. 6 ваганетак за 7 гадзін могуць нагрузіць дзесяць вагонаў, а фактычна за 21 гадзіну яны нагружаюць 4-5. Вагоны прастойваюць па 10-15 гадзін.

Справа ў тым, што загадчык пункта Чэпіна **Ушакоў** не арганізаваў работы па выгрузцы і пагрузцы. Ваганеткі ў рэйсе знаходзяцца больш гадзіны, брыгады стаяць па некалькі гадзін без работы. Не хапае вагаў. Няма таксіроўшчыкаў. Працоўная дысцыпліна—ў занепадзе, нормы пастаянна не выконваюцца.

С.

У 6 раз менш

СЯННО. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). СЕННЕНСКІ РАЁН МОГ-БЫ СКОНЧЫЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ДА 6 КАСТРЫЧНІКА, КАЛІ-Б ЧЫГУНКА СВАЯЧАСОВА ПАДАВАЛА ВАГОНЫ.

АРШАНСКІ ЧЫГУНАЧНЫ РАЁН САБАТУЕ ПАДАЧУ ПАРАЖНЯКА. НА ПРАЦЯГУ РАДА ДЗЁН РАЁНУ ЗУСІМ НЕ ДАЛІ ВАГОНАЎ. БЫЛІ ДНІ, КАЛІ ЗАМЕСТ 30-ці ВАГОНАЎ ПАДАВАЛІ 5-6. АРШАНСКІ РАЁН ЧЫГУНКІ ПАВІНЕН БОЛЬШ УВАГІ АДДАЦЬ АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ З СЕННЕНШЧЫНЫ.

Р—я.

Не падаюць паражняка

ЖОДЗІНА. Тры раёны—Плешчаніцкі, Лагойскі, Смалявіцкі—грузяць бульбу па станцыі Жодзіна. Аршанскі раён МБВ чыгункі злачынна ігнаруе падачу паражняка на станцыю. 25-га, 28, 30 верасня і 3 кастрычніка не падан ні адзін вагон. Бываюць дні, калі станцыі перападае 1-2 вагоны. Няма нічога дзіўнага, што на прыёмачным пункце скапілася пад адкрытым небам больш 2 тыс. тон бульбы.

На перагоне, на адлегласці 10 кілометраў, некалькі дзён назад стаяла 6 штук пустых вагонаў. Але начальнік станцыі **Барысаў** адмовіўся даць паравоз, каб падгнаць паражняк да Жодзіна, і вагоны засталіся стаяць недагружанымі. Гэта выключны выпадак бюракратычных адносін да адгрузкі Ленінграду.

Ёсць шмат фактаў няўмення чыгункі манеўраваць наяўным паражняком. На некаторых станцыях («Камунары», Смалявічы) падавалі столькі вагонаў, што іх не паспявалі затружаць, заставалася па 8-10 вагонаў непагружанымі, а на другіх станцыях паражняка зусім не было.

Аршанскі раён павінен забяспечыць выразную падачу вагонаў станцыям.

В.



Пагрузка бульбы ў вагоны на станцыі Маршыхі, П.-У. чыгунка.

Заторы на прыёмцы

УВАРАВІЧЫ. У раёне працуюць 4 прыёмачныя пункты па бульбе, да якіх штодзённа цягнуцца сотні фурманак з калгасаў і вёсак.

Адзін калгас імя Будзённага за чатыры дні работы адгрузіў 50 проц. свайго задання. Вельмі добра арганізавана адпраўка бульбы з калгаса «Авангард».

Але з-за недахвата паражняка на прыёмачных пунктах ствараюцца заторы. Так, на станцыі Прыбар накапілася некалькі соцень тон, звыш 250 тон сабралася на ст. Уза, куды здае бульбу большасць сельсоветаў Уравіцкага раёна.

На прыстаньскім прыёмачным пункце на р. Дняпро (Смычкоўскі сельсавет) накапілася больш 200 тон. Прадукцыя ссыпалася ў свіран, прычым з-за памернай нагрузкі сцены свірна развальваюцца.

А. К.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

ВЫСУШЫЦЬ ДА АДЗІНАЙ ЦАГЛІНКІ ЗДАБЫТЫ ТОРФ

Закончыць будаўніцтва завода коксуючагася торфа

На Міхановіцкіх торфараспрацоўках будуецца першы ў Беларусі завод для каксавання торфа.

Завод вопытнага тыпа разлічан на пераапрацоўку **5.500** тон торфа ў год, што дае каля **1.800** тон кокса і **300** тон смалы.

Кокс пойдзе для выплаўкі чыгуна ў вагранках, для кавальскіх работ, выраба друкарскай чэрні і, нарэшце, для выпрацоўкі актыўнага вугляматэрыяла, неабходнага ў цэлым радзе вытворчасцяй і патрэб абароны.

Смала дасць нам сырэц для выраба друкарскай фарбы, штучнай аліфы і пластычных мас. Гудрон, які застаецца пасля дэстыляцыі смалы, можа быць скарыстан для дарожнага будаўніцтва і кансервавання дрэва.

Праект торфакаксавальнага завода быў распрацаван яшчэ ў 1930-31 г. навукова-даследчым інстытутам прамысловасці. Спецыялістамі маскоўскага інсторфа на чале з т. Ів. Ів. **Радчанка,** праект ухвалены і зацверджан СНК БССР. Тэрмін сканчэння пабудовы быў устаноўлен да 1 кастрычніка 1932 г.

Аднак, не гледзячы на дырэктывы ўрада, гэты завод, якому належыць адыграць важнейшую ролю ў справе развіцця хіміка-тэхналагічнай пераапрацоўкі торфа ў БССР, у вызначаны тэрмін не пабудован. Пуск завода быў адкладзен на 15 жніўня 1933 г. Даўно прайшло і 15 жніўня, а дырэктыва ўсё яшчэ не выканана.

Ходам пабудовы завода зацікавілася камісія выканання пры СНК. 9 верасня гэтага года камісія абавязала Белбудпромтрэст пад адказнасць дырэктара тав. **Васермана** закончыць пабудову ў 20-дзённы тэрмін з моманта атрымання агнятрывалай цэглы. Гэты тэрмін канчаецца 10 кастрычніка.

Але пабудова завода зараз толькі пачынаецца. Калі будуць такія-ж марудныя тэмпы работы, то завод не будзе закончан і праз 200 дзён.

Якія прычыны тармозяць пабудову завода? Перш за ўсё недахват матэрыялаў: цэглы, вапны, цэмента, лесу, цвікоў. Дастаўленая вапна не гасіцца і з'яўляецца крэйдай. Рабочай сілы вельмі мала. У дзень агляда мною завода (29 верасня) працавала толькі два каменшчыкі.

Металовае абсталяванне для завода і па сённешні дзень не гатова: ваганеткі не дастаўлены, а на рэйкі нават не атрымана парадаў.

На заводзе пакуль што яшчэ не відаць і дапаможнага абсталявання: электраматораў, вентылятараў і дробнай арматуры.

Будаўніцтва каксавальнай печы ідзе пад адкрытым небам, нават навес не пабудован. У дажджлівыя дні будаўніцтва спыняецца, а катлаваны затапляюцца водай.

Лічу неабходным звярнуць увагу грамадзкасці і адпаведных органаў на выпэйнералічаныя дэфекты ў будаўніцтве торфа-каксавальнага завода. Яны тлумачацца недаацэнкай з боку раду арганізацый яго значэння ў нашай гаспадарцы, як выходнай базы для новых вытворчасцяй.

Мы вывучалі ў інстытуце прамысловасці метады для атрымання з торфа друкарскай фарбы, штучнай аліфы, актыўнага вугля і г. д.

Мы расходвалі даволі буйныя сумы грошай па даследчых работы па скарыстанні прадуктаў каксавання торфа, па падрыхтоўку кадраў па хімічнай тэхналогіі торфа. Але калі мы хочам, каб рэзультаты навуковых работ не захоўваліся без карысці ў архіве, калі мы хочам, каб маладыя спецыялісты прыклалі свае веды для далейшых даследаў, калі мы сапраўды маем патрэбу ў тэрмічнай пераапрацоўцы торфа, то трэба падтрымаць пачын навукова-даследчага інстытута ў справе стварэння першай прамысловай адзінкі па каксаванні торфа.

Праф. ЗМАЧЫНСКІ.

КОЖНУЮ ЦАГЛІНУ ТОРФА ЗРАБІЦЬ ТАВАРНАЙ

У гэтым годзе, не гледзячы на нездавальняючыя метэаралагічныя ўмовы, Асінторф упярыню пачынае падышоў да выканання плана торфазда бычы. Здабыта 100.000 тон машынафармовачнага торфа або 96 проц. плана.

Торфу, якога можна выкарыстаць (затрабелёванага), выраблена ўсяго толькі 23.000 тон, з якіх звыш 17 тыс. ужо выкарыстаў БелДРЭС.

У чым справа? Чаму таварнага торфу на заводзе толькі 23-24 проц.?

Самым выразным адказам на гэта пытанне з'яўляюцца лічбы і факты аб рабоце тарфянікоў і іх кіраўнікоў.

Выкананне торфплана з 58 проц. у маі, чэрвені ўзнялося да **363** проц. у жніўні і 10 дзён верасня. Колькасць ападкаў дасягнула ў жніўні 127 проц.

З гэтага відаць, што асноўная маса торфа здабыта ў канцы сезона і нават пасля яго. Пачатак сезона (май-чэрвень), як лепшы час для сушкі, не быў выкарыстан. У рэзультаце наяўны торф мае вільготнасць да 60 і больш процантаў.

Хіба не ясна, што ўсе гэтыя лічбы ставяць перад кіраўніцтвам канкрэтную і ўдарную задачу:

— Скарыстаць кожную мінуту для таго, каб высушыць торф.

Так трэба, але так не робіцца. Становішча з сушкай пагражаючае. Прадукцыйнасць працы тарфянікоў на сушцы значна панізілася. Калі па зда бываньні торфа спрэдні процант прадукцыйнасці працы тарфяніка выяўляўся ў 65-95 процантаў, то на сушцы гэтыя паказальнікі знізіліся да 50-60, а ў паасобных выпадках нормы сушкі выконваюцца не больш 10-16 проц. (брыгады **Паўлава, Скішанта, Лішакова** і інш.).

З якасцю сушкі яшчэ горш. Тэхнічныя правілы не выконваюцца, маюць месца варварскія адносіны да торфа. У кар'еры № 2 (дзесятнік **Углік**) укладка клотак робіцца няправільна, без зазораў, «гаршком», што не дае магчымасці торфу прасыхаць. Устаноўленыя клеткі часта развальваюцца, тарфяныя цаглінкі ламаюцца, значна павышаецца процант страт. Такое-ж становішча на ўчастках дзесятнікаў **Казначэнка, Курачкіна** і інш.

На тых участках, дзе да справы адносяцца сумленна, дзе тарфянікі добра праінструктаваны, дзе ёсць сапраўды гаспадарчае вёда брыгадзіраў і дзесятнікаў (Немальцаў, Маргуноў, Садоўнічая, Фёдарава), — клеткі прасторныя, шырокія, высокія, моцныя, торф не крышыцца і хутка сохне.

Такім чынам прычыны не ў падворі, а ў людзях, у арганізаванасці працы.

Асінторф сярод усіх тарфяных заводаў Саюза мае найбольшую насычанасць кваліфікаванымі тэхнічнымі кадрамі. На ім шэсць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і дзесяткі тэхнікаў. Але яны выкарыстоўваюцца вельмі дрэнна. Перабудова тэхнічнага кіраўніцтва на аснове пастановы ЦК і СНК аб Дазбасе на Асінторфе праведзена фармальна. Спецыялісты «прымацаваны» да паасобных участкаў, кар'ераў і агрэгатаў, але рэзультатаў ніякіх. Прымацаваныя не пашлі ў брыгаду, не навучылі тарфяніка, як трэба працаваць, прадпісваюць «кіраваць» з кабінэтаў.

Адсюль і «тэмпы», адсюль і «якасць» работы на сушцы.

Брыгада «Звязды»: **В. ДАЛЬ, АР. ЗАРУБЕЖНЫ.**

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

Максімальна паскорыць будаўніцтва на калгасных фермах

НІ АДНОЙ МІНУТЫ ДАЛЕЙШАЙ МАРУДНАСЦІ З СІЛАСАВАННЕМ

Месячнік падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы

У парадку разгортвання работ па правядзенні ўсебеларускага пахода за высокаякасную жывёлагадоўлю Наркамзем БССР абвясціў з 5 кастрычніка месячнік падрыхтоўкі да зімовага стойлавага перыяда жывёлы.

Канкрэтным адказам усіх калгаснікаў БССР на заклік калгаснікаў Случчыны ў гэты месячнік павінна быць усямернае забеспячэнне пагалоўя цёплай і сытай зімоўкай.

Адной з рашаючых умоў для паспяховай зімоўкі з'яўляецца ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СТАДА СУХІМІ І ЦЁПЛЫМІ ПАМЯШКАННЯМІ. У калгасах ідзе вялікае будаўніцтва абор, свінарнікаў, але гэта будаўніцтва разгортваецца такімі павольнымі тэмпамі, што паўстае вялікая пагроза, ці будзе ўсё гэта будаўніцтва скончана да зімы.

У Рагачоўскім раёне будаўнічыя работы на фермах скончаны на 40 проц., у Слуцкім—на 55 проц., Бабруйскім—на 40 проц. Гэткае становішча і ў радзе іншых раёнаў. Будаўніцтва затрымліваецца менш за ўсё з за адсутнасці матэрыялаў або рабсілы. Справа ў тым, што ў радзе калгасаў на гэта не звачаюць належнай увагі. У калгасе «Случ № 2» (Случчына) мы маем і такія факты, што нават пры наяўнасці вольнай рабочай сілы праўленне калгаса адмаўляецца вызначыць паўную колькасць калгаснікаў для заканчэння пачатага будаўніцтвам свінарніка.

Было-б памылковым узяць установку на абавязковае сканчэнне сёлета ўсяго пачатага будаўніцтва. Некаторыя калгасы гэтай магчымасці сапраўды не маюць. Задача заключаецца ў тым, каб скончыць будаўніцтва тых абор і свінарнікаў, без якіх не можа быць забяспечана зімоўка жывёлы.

Такім чынам, усе сілы на калгасных фермах павінны быць на працягу гэтага месячніка накіраваны на СКАНЧЭННЕ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЦІ АБ'ЕКТАЎ, уся ўвага павінна сканцэнтравацца на АЦЯПЛЕННІ наяўных памяшканняў, на прыстасаванні ўсіх падыходзячых гаспадарчых будынкаў для жывёлы.

Другой не менш важнай задачай месячніка з'яўляецца ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЎСЯГО ПАГАЛОЎЯ КАРМАМІ. У шмат якіх калгасах востра стаіць пытанне аб кормах у сувязі з дажджлівым надвор'ем гэтага лета. У гэтых умовах асабліва важнае значэнне набывае сілас.

У цэлым радзе раёнаў мае месца кулацкі сабатаж сіласавання. Сіроцінскі раён засіласаваў толькі 8,4 проц. задання, Бешанковіцкі—10,4 проц., Чэрыкаўскі—10,3 проц., Чырвонапольскі—6,9 проц., Рэчыцкі — 9,4 проц.

Трэба неадкладна піквідаваць адставанне ў закладцы сіласнай масы ў ямы і вежы. У працягу кастрычніка ўвесь план сіласавання абавязкова павінен быць выканан.

Саўгасы і калгасы павінны ПРАВЕСЦІ ПАГАЛОЎНЫ ВЕТЭРЫНАРНЫ І ЗООТЭХНІЧНЫ АГЛЯД ЖЫВЁЛЫ, перавесці заразліва-хворую жывёлу ў асобныя памяшканні. Усё стада разбіць на групы і для кожнай групы вызначыць нормы кармлення на стойлавы перыяд.

Для паляпшання нагляду за ўтрыманнем жывёлы арганізаваць ГРАМАДСКІЯ ІНСПЕКЦЫІ па жывёлагадоўлі з лепшых калгаснікаў і калгаснік-ударнікаў.

На працягу месячніка трэба забяспечыць правядзенне ва ўсіх раёнах ВЫТВОРЧЫХ КАНФЕРЭНЦЫЙ ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, арганізацыю раённых і міжраённых ВЫСТАВАК, шырока разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва за добраякасную і своячасовую падрыхтоўку да стойлавага перыяда.

Месячнік павінен узняць новую хвалю энтузіязма ў барацьбе за першынства ва ўсесаюзным конкурсе на лепшую жывёлагадоўчую ферму, ва ўсебеларускім паходзе за высокаякасную жывёлагадоўлю.

К—н.

ЗРЫЎШЧЫКІ СІЛАСАВАННЯ

ЧАВУСЫ. Сіласаванне па саўгасах раёна—пад пагрозай зрыва.

Саўгас **«Далёкая ніва»** не засіласаваў яшчэ ні адной тоны. Сіласныя ямы і траншэі засыпаны пяском і па закіданы дрывамі. Аб іх рамонце дырэкцыя саўгаса яшчэ і не падумала. Між тым саўгас павінен засіласаваць не менш 200 тон.

Дырэктар саўгаса **Башко** кажа: «Сёлета сіласаваць не буду, рабочай сілы не хапае».

Не лепшая справа з сіласаваннем у саўгасе **«Авангард»,** які павінен засіласаваць 300 тон зялёнай масы.

На 1-е кастрычніка ў саўгасе закладзена сіласа толькі 65 тон, прычым сілас закладваецца ў вежу на працягу ўсяго лета, так што ён ужо страціў усякую вартасць.

Дырэктар саўгаса **Мінгіновіч** сваю бяздзейнасць тлумачыць тым, што «план сіласавання для саўгаса непасільны і зялёнай масы не хапае».

А ў гэты час у саўгасе гніе бульбянік. Мінгіновіч знаходзіць, што бульбянік для сіласавання не гадзіцца. У выніку безгаспадарчасці дырок цыі ў саўгасе згніла віка, вызначаная для сіласа.

Трэба безадкладна папярэдзіць магчымасць зрыва забеспячэння пагалоўя сакавітымі кармамі.

П.

УВЕСЬ БУЛЬБЯНІК ВЫКАРЫСТАЦЬ НА СІЛАС

РАГАЧОЎ. Рад калгасаў МТС на заклік калгаснікаў Случчыны аб стварэнні моцнай кармовай базы для жывёлы адказваюць перавыкананнем плана сіласавання.

Калгас **«Чырвоныя борні»,** маючы па плану засіласаваць 81 тону, засіласаваў 119 тон. Калгас «Вызваленне» замест 60 засіласаваў 130 тон. Калгас імя Красіна замест 243 засіласаваў 350 тон.

Перавыкананнем планаў сіласавання гэтыя калгасы пастанавілі забяспечыць сіласам уласных кароў калгаснікаў і такім чынам ліквідаваць недахват грубых кармоў.

Аднак, такія адносіны да забеспячэння пагалоўя кармамі далёка не ва ўсіх калгасах. Калгасу **«Ударнік»** не хапае сена. Здавалася, што лепш за ўсё гэты недахват пакрыць сіласам. Але калгас засіласаваў усяго толькі 27 тон.—Нам пакуль што сіласа хопіць,—кажа старшыня калгаса Буслаў,—а пасля дзе-небудзь пазычым кармоў.

Сем сельсоветаў раёна яшчэ зусім не прыступілі да сіласавання. Гэта **Асаўніцкі, Азяранскі, Зборaўскі, Побалаўскі, Старасельскі, Станькаўскі і Вышынскі.** У гэтых сельсоветах зусім ігнаруецца бульбянік для сіласавання.

Загадчык райза тав. Еўдачкоў і кіраўніцтва райаб'яднання калгасных ферм справамі сіласавання зусім не займаецца. Райза нават не мае дакладнага ўліку хода сіласавання ў раёне.

Рагачоўшчына мае магчымасць адным бульбянікам у два разы перавыканаць план сіласавання. Трэба толькі, каб гэтай справай у раёне заняліся сур'ёзна.

В.

Селязнёў здзекуецца з сям'і чырвонаармейца

(Ліст служачай)

Два месяцы таму назад рабочы менскай машына-трактарнай майстэрні тав. **Дзёмчын** прызван у рады Чырвонай арміі. Кіраўніцтва МТМ на чале з дырэктарам **Селязнёвым** не толькі не патурбавалася аб аказанні матэрыяльнай дапамогі сям'і Дзёмчына, а наадварот, падвергнула яе раду агідных ганенняў.

Сям'я Дзёмчына засталася жыць у рабочым інтэрнаце МТМ № 77 **(Чэрвенскі тракт).** Дырэктар **Селязнёў,** узяў курс на высяленне яе з інтэрната. Нядаўна яна атрымала суровы загад адміністратара Селязнёва: «аслабаніць кватэру, у іншым выпадку рэчы будуць выкінуты на вуліцу».

У мэтах адшукання сродкаў на ўтрыманне сям'і, матка Дзёмчына звярталася да Селязнёва аб прадстаўленні ёй работы, між тым апошні быццам з-за адсутнасці свабодных вакансій, адмовіў ёй, у гэты-ж самы час у сталовай МТМ не хапала двух работніц. На гэта месца Селязнёў знайшоў больш выгадным узяць двух жанчын, якія не атрымалі пашпартоў з прычыны іх судзімасці.

Зараз матка чырвонаармейца Дзёмчына працуе ў Менгарсовеце ў якасці прыбіральшчыцы, аднак, і тут **Селязнёў** хоча паказаць сваё дырэктарскае «я». Ён забараніў каменданту будынку выдаваць дамавую кнігу гр. Дзёмчынай для заяўкі ўтрымальцаў. У выніку з мая месяца г. г. яе утрымальцы пазбаўлены права атрымання паборных дакументаў.

Аб усіх гэтых агіднасцях добра ведае мясцовая партыйная ячэйка, але ніякіх канкрэтных мер і да гэтага часу не прыняла.

Асіповіч.

Ад рэдакцыі: Змяшчаючы ліст тав. **Асіповіч,** «Звязда» лічыць недапушчальнымі адносіны дырэктара МТМ **Селязнёва** да сям'і чырвонаармейца **Дзёмчына.**

Менская ГКК РСІ павінна тэрміновa рэагаваць на іх.

Не ведаюць профіля

(ЛІСТ СТУДЭНТА)

У свой час **«Звязда»** сігналізавала пра дрэнную пастаноўку навучання на **крытычна-творчым** аддзяленні літфака **ВПІ.** Але работа ніколькі не палепшылася.

Мэтавая ўстаноўка аддзялення не апраўдала сябе і НКА ў гэтым годзе спыніў прыём на яго. Але застаўся трэці курс (апошні набор), у ліку звыш **15** чалавек, і вось яго лёс прымушае зараз біць трывогу. Замест таго, каб кіруюцца пастановай ЦВК СССР аб вышэйшай школе знішчыць шматпрадметнасць, пераключыцца хаця-б на мінімум журналісцкіх дысцыплін — дырэкцыя стала на шлях «універсалізма» і зноў працягвае рыхтаваць няма-ведама кагo... Па працягу двух з паловай год займаліся ўсім чым заўгодна, апроч прадметаў, дакладна акрэсліваючых профіль будучага спецыяліста. Вывучалі літаратуру (да рэчы, у выкладанні «вядомага» прафесара **П. Бузука...**) да тэхналёгіі дрэва! Цяпер праходзіцца таксама 7 розпастайных дысцыплін, і характэрна, што толькі ў гэтым годзе сталі вывучаць літаратуру, прычым адразу, беларускую, рускую і заходнеэўрапейскую. У выніку галавацяпскага расклада студэнты прымушаны «праглатваць» да **600** друкаваных старонак матэрыяла за адзін дзень, не лічачы слухання лекцый.

Дэкапат крытычна-творчага аддзялення не цікавіцца становішчам. На курсе пануюць групаўшчына, заціск самакрытыкі.

Наркамаветы трэба неадкладна пераключыць навучанне студэнтаў 3-га курса крытычна-творчага аддзялення на канкрэтны профіль спецыяліста.

Л. ЮРКЕВІЧ.

ПАБУДУЕМ

эскадрылью

ІМЯ т. КАГАНОВІЧА

На бягучым рахунку 982.625 рублёў

За 10 кастрычніка па бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7814 паступіла 5.699 рублёў. Ад арганізацый і ўстаноў г. **Менска:** з прафк. ІІІ АДПУ — 1.266 руб., кіраўніцтва спраў ЦК КП(б)Б — 168 руб., ад торфарцелі імя Дзяржынскага — 148 руб., МК інстытута соўбудаўніцтва і права — 91 руб., гаркасы — 47 руб. З раёнаў: **Магілеўскага** — 3.949 руб. і **Асвейскага** — 20 руб.

Ад пачатку збора на бягучы рахунак Дзяржбанка паступіла 982.625 рублёў.

Уносяць і выклікаюць

Выклік т. **Кляшчова** я, дырэктар сіроцінскай МТС, прымаю. Уношу 20 руб. на пабудову авіяэскадрыльі імя т. **Кагановіча** і выклікаю паступных т. т.: **Жураўскага** (дырэктар саўгаса Лескавічы), **Сілівонава** (дырэктар ільназавода № 34), **Дахіна** (старшы механік МТС), **Смусевіча** (заг. райза), **Канушына** (РВК), **Давыдовіча** (дырэктар луггаса Чэрніцы) і **Саламоніка** (старш. агранам. МТС).

СІНІЧКІН.

На выклік т. **А. Дикляска** тав. **Шастакоў** («Калгаснік Беларусі») унёс у фонд пабудовы эскадрыльі дадаткова 10 руб.

На выклік т. **Кунінай** я, работнік Белта, уношу 10 руб. і выклікаю наследваць майму прыкладу **т. т. Блюмкіна, Рудзько** (БЕЛТА), **Семенкова** («Калгаснік Беларусі»), **Дамброўскага, Клеменка** («Калгаснік Петрыкоўшчыны»), **Кірштэйна** («Ударнік Дзяржыншчыны»), **Гольдшварц** (Горкі), **Праэду** (Дзяржбібліятэка), **Мелешкевіча** (Клімавіцкая райгазета).

СІМХОВІЧ.

Пасталаўскі райлесрабочком саюза леса і сплава. Старобінскага раёна, сабраў сярод рабочых і служачых на пабудову авіяэскадрыльі імя т. Кагановіча 995 руб. Грошы пераведзены па рахунак Дзяржбанка.

У часе правядзення прызыва ў РСЧА ў **Лоеўскім** раёне сярод дапрызыўнікаў сабрана ў фонд пабудовы эскадрыльі імя т. Кагановіча 101 рубель.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЖЭНЕВА

ПОЎНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ ГЕРМАНІІ

ПАЗШ ПАГРАЖАЮЦЬ БЛАКАДАЙ ГЕРМАНІІ

Н'Ю-ІОРК, 9. (БЕЛТА).

«Геральд трыбюн» публікуе інспіраванае напаўдамленне свайго вашынгтонскага карэспандэнта, якое гаворыць, што дзяржаўны дэпартамант намерае на магчымасць пратэста з боку ПАЗШ супроць пагрозы Германіі павялічыць свае ўзбраенні.

Паводле слоў дзяржаўнага дэпартамента, не выключана, што ПАЗШ сумесна з Лігай нацый арганізуюць блакаду Германіі, калі яна прывядзе сваю пагрозу ў выкананне.

ІТАЛІЯ НЕ ЗДАВОЛЕНА ГЕРМАНСКІМ АДКАЗАМ

ПАРЫЖ, 9. (БЕЛТА).

Рымскі карэспандэнт «Тан» паведамляе, што ў італьянскіх палітколах германскі адказ па пытанні аб разазбраенні выклікаў нездавальненне, паколькі Германія не прыняла пад увагу рады італьянскага ўрада захоўваць умеранасць.

Карэспандэнт «Тан» падкрэслівае, што нездавальненне Італіі выклікаецца не толькі сутнасцю германскіх патрабаванняў, колькі апасеннем, што непрымальнасць германскага адказа для Францыі пазбавіць Італію выгоднай для яе ролі пасрэдніка.

У БЕЗВЫХОДНЫМ ТУПІКУ

ЖЭНЕВА, 9. (БЕЛТА).

9-га кастрычніка, пасля трохмесячнага перапынка, адбылося закрытае пасяджэнне бюро канферэнцыі па разазбраенні.

Гендэрсон далажыў аб сваіх пасядках па Эўроце і аб рэзультатах перагавораў. Спачатку ён запэўніваў, што па большасці навырашаных пытанняў няма сур'ёзных перашкод, для дасягнення згоды. З далейшага-ж высветлілася, што іменна меншасць нявырашаных пытанняў складаецца з найбольш істотных, таму няма нічога дзіўнага, што Гендэрсон пасля аптымістычнага пачатку закончыў прамову ў самым мінорным тоне, заявіўшы, што пасля ўсіх апошніх перагавораў наўрад ці ўдасца дабіцца найлепшых поспехаў, каб публічная дыскусія магла прынесці карысць.

Разам з тым, Гендэрсон падкрэсліў непажаданасць далейшага адтэрмінавання генеральнай камісіі, каб не даваць пажывы і без таго пашыранай думцы, што канферэнцыя па разазбраенні не намерана ажыццявіць скарачэнне і абмежаванне ўзбраенняў.

Выступленне Гендэрсона ліпні раз характарызуе тупік, у якім знаходзіцца канферэнцыя. Наступнае пасяджэнне бюро пазначана на 16 кастрычніка.

ГЕРМАНСКІЯ ФАШЫСТЫ НАВАДНЯЮЦЬ ПАЗШ СВАІМІ АГЕНТАМІ

Н'Ю-ІОРК, 9. (БЕЛТА).

Старшыня іміграцыйнага камітэта палаты прадстаўнікоў ПАЗШ Дыштэйн расследуе дзейнасць германскіх нацыянал-сацыялістаў у ПАЗШ.

Паводле вестак Дыштэйна, за кароткі час у ПАЗШ прыехала 300 немцаў пад выглядам абслугоўваючага персанала германскіх консульстваў.

«Гэта лічба, — сказаў ён, — смехатворна вялікая для звычайных консульскіх прадстаўніцтваў. Гебельс асабіста адбірае тых, хто накіроўваецца ў ПАЗШ. У іх распараджэнні мільёны марак на прапаганду, канчатковая мета якой — звяржэнне ўрада ў ПАЗШ, устанаўленне дыктатуры паводле нацыянал-сацыялістскага ўзора». Дыштэйн заявіў, што ў яго задачу ўваходзіць выцяненне нацыянал-сацыялістскіх прапагандыстаў з ПАЗШ.

САМАЛЁТЫ ЗА ЛІК ДАПАМОГІ БЕСПРАЦОЎНЫМ

ВЕНА, 9. (БЕЛТА).

Як паведамляецца з Берліна, у гарадку Гота з 45 тыс. жыхароў, які знаходзіцца ў найбольш паражонай крызісам Турынгіі, муніцыялітэт будзе самалёты для ўсегерманскага таварыства паветранага флота за кошт урэзкі дапамог беспрацоўным.

МАСАВАЯ ЗАБАСТОЎКА ПАРЫЖСКІХ ТАБАЧНІКАЎ

ПАРЫЖ, 9. (БЕЛТА).

Рабочыя 23 табачных і шасці запалкавых фабрык правялі паўдзённую забастоўку пратэста супроць дэкрэта аб пераводзе на агульнае становішча рабочых некаторых дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў, якія карысталіся да апошняга часу поўнымі льготамі ў адносінах адпускоў і дапамог на хваробе пароўні з ніжэйшымі катэгорыямі служачых.

ПАГІБЕЛЬ АНГЕЛЬСКАЙ ПАДВОДНАЙ ЛОДКІ

ЛОНДАН, 9. (БЕЛТА).

8-га кастрычніка каля Кемпфбелтаўча (Шатландыя) уварвалася падводная лодка «Л-26». З экіпажа двое забітых, 10 цяжка параненых і 4 лёгка параненых. Пажар на лодцы цягнуўся 4 гадзіны. Сёмага кастрычніка гэтая-ж падводная лодка затанула, але была паднята.

Узрыў адбыўся ў часе заладкі батарэй. На агульную думку, узрыў выклікан скапленнем хлорыстых злучэнняў, узнікшых пад уплывам вады, якая прасачылася ў батарэі пры першай аварыі.

НОВЫ УРАД ГІШПАНІІ

ПАРЫЖ, 9. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Мадрыда, новы ўрад Барыо расцэньваецца, як урад Леруса без Леруса. Хоць фармальна Лерус (лідэр партыі радыкалаў) у габінет не ўвайшоў, новы ўрад па свайму складу не адрозніваецца істотна ад вышаўпомянага ў адстаўку габінета Леруса.

Як і чакалася, першым-жа крокам новага габінета быў роспуск картэсаў і назначэнне новых выбараў, г. зн. выкананне асноўнага пункта лерусаўскай праграмы.

Пад лозунгамі барацьбы з узрастаючым у горадзе і вёсцы масавым рэвалюцыйным рухам на фоне ўсё больш прагрэсуючага эканамічнага крызіса, вакол Леруса яднаюцца зараз усе буржуазна-памешчыцкія партыі, не выключаючы манархістаў.

Нядарма ў сваёй дэкларацыі ў парламенце Лерус гаварыў аб прыцягненні да работы і тых, хто «лаяльна служыў манархіі». Пад сцягам адзінага буржуазна-памешчыцкага фронта, будуць праводзіцца парламенцкія выбары 19-га лістапада.

Гэтаму фронту компартыя Гішпаніі процідпастаўляе стварэнне адзінага рэвалюцыйнага рабочага фронта, расцэньваючы сучасныя падзеі, як крок да фашызацыі дзяржавы.

ПРАЦЭС АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА

ПАДРЫХТОЎКА АБВІНАВАЧАННЯ ТОРГЛЕРА, ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА, ТАНЕВА У „ДЗЯРЖАЎНАЙ ЗДРАДЗЕ"

ПРАГА, 10. (БЕЛТА).

Будынак рэйхстага, куды перанесены пасяджэнні лейпцыгскага суда, з раніцы апечлен узмоцненым атрадам паліцыі.

Усіх наведвальнікаў, у тым ліку журналістаў, строга абшукваюць.

У пачатку пасяджэння старшыня палічыў патрэбным падкрэсліць, што цяпер перад судом выступяць свабодныя і незалежныя «сведкі», якія адказны толькі перад богам і ўласным сумленнем. «Гэтыя словы гучаць адзекам, калі ўспомніць, што рад сведак накшталт Цахава прыводзяцца проста з канцлагераў, а астатнія сведкі—паліцэйскія чыноўнікі і яўныя правакатары.

Паведамленне Вольф указвае, што на берлінскай сесіі суда выступяць пажарныя эксперты, у прыватнасці берлінскі пажарны інспектар Вагнер і прафесар Іоссе, аднак, прозвішча Гемпа, кіраваўшага тушэннем пажара, сярод экспертаў няма. Зварачае на сябе ўвагу тое, што сёнешняя «Нахтаўсгабе» залуляе, што абвінавачанне адносіцца не толькі да падпала рэйхстага, але «галоўным чынам да дзяржаўнай здрады ў дні перад падпалам».

У першую чаргу, паводле слоў газеты, гэта датычыць Торглера і абвінавачаных балгар. Відавочна, нават фашысцкі друк траціць упэўненасць у тым, што ўдасца сканструяваць» доказы» ўдзельнасці Торглера і балгар у падпале, і ў сувязі з гэтым хоча загадзя падрыхтаваць грамадскую думку да вынясення прыгавора на абвінавачанню ў дзяржаўнай здрадзе.

* * *

ПРАГА, 10. (БЕЛТА).

На сёнешнім пасяджэнні працэса аб падпале рэйхстага ў Берліне першым дапытваецца студэнт тэалогіі Флетэр.

«Сведка» расказвае, што ён у вечар падпала рэйхстага, каля 9 гадзін, ішоў дамоў міма рэйхстага, пачуў звон разбіваемага шкла і ўбачыў чалавека з запаленым факелам у руцэ.

«Сведка» не можа сказаць, як выглядзеў чалавек з факелам і ўказвае толькі, што ён быў без шляпы і без пальто.

Старшыня ўпарта пытае, ці бачыў «сведка» аднаго чалавека ці дваіх, бо другі «сведка» бачыў дваіх. Флетэр катэгарычна гаворыць, што бачыў толькі аднаго. Дзімітраў запытвае «сведку» аб яго партыйнай прыналежнасці. Флетэр сцвярджае, што ён ніколі не быў ні ў якай партыі.

Пролетарыі Англіі пратэстуюць супроць лейпцыгскай правакацыі

ЛОНДАН, 10. (БЕЛТА).

Рабочыя арганізацыі працягваюць пратэставаць супроць лейпцыгскага працэса.

Сярод арганізацый, вынесшых рэзалюцыі пратэста у апошнія дні—гарнякі Ферндэля, муніцыпальныя рабочыя Варынгтона і г. д. Камітэт абароны аб вінавачаных па лейпцыгскім працэсе арганізуе мітынгі пратэста у Лондоне, Манчэстэры і іншых гарадах.

„БУЙНАЕ НАВУКОВАЕ ДАСЯГНЕННЕ"

АМЕРЫКАНСКАЯ ПРЭСА АБ ПАЛЁЦЕ СТРАТАСТАТА „СССР"

Н'Ю-ІОРК, 9. (БЕЛТА).

Большая часка амерыканскага правінцыяльнага друку спрыяльна каментуе палёт стратастата «СССР».

Паводле слоў газеты «Патрыёт», «палёт совецкага стратастата з'яўляецца буйным навуковым дасягненнем і разбівае думку настроеных супроць СССР людзей, якія лічаць рускіх адсталым народам».

Газета «Комерцыял абпіл», якая выходзіць у Мемфісе (штат Тэнесці), заўважае, што «палёт совецкага стратастата значна навышае простых рускіх. Настойлівасць рускіх перамагла. У роўнай меры рускія аказаліся настойлівымі і ў іншых дасягненнях, не гледзячы на працідзеянне ўсяго света за апошнія 16 год і наперакор таму, падабалася гэта ці не падабалася іншым».

«Увесь свет, — заўважае бостонская «Трэвелер», — апладыруе Совецкаму саюзу ў гэтым спаборніцтве».

«Н'ю-Іорк таймс» прысвячае спецыяльны артыкул заг. навуковым аддзелам газеты «Кемфер таг».

Ён указвае, што палёт быў праведзен бліскуча».

«Совецкі саюз, — піша Кемпфер, — адносіцца да навукі, можа быць, нават сур'ёзней, чым заходня-эўрапейскія краіны. Аб гэтым гаворыць ліхаманкавая актыўнасць, якая прыявяла да стварэння трактарных, хімічных заводаў, сталіліцейных прадпрыемстваў, гідраэлектрычных станцый, узорных сельскіх гаспадарак і г. д.».

ПРАФЕСАР КОЗЕНС АБ ПАЛЁЦЕ СТРАТАСТАТА „СССР"

ПАРЫЖ, 9. (БЕЛТА).

З Брусселя паведамляюць, што ўвесь бельгійскі друк апублікаваў паведамлен не аб палёце совецкага стратастата. Пра фесар Козенс, які суправаджаў Пікара пры яго палёце ў стратасферу, заявіў прадстаўніком друку, што яго вельмі радуе поспех совецкага стратастата.

ПАЛКОЎНІК ФІЛІПОВІЧ АБ СССР

ВАРШАВА, 9. (БЕЛТА).

Дырэктар дэпартамента грамадзянскай авіяцыі палкоўнік Філіповіч пасля зварота з СССР змяшчае ў афіцыёзнай «Газета польска» рад нарысаў аб сваім прабыванні ў СССР. Філіповіч падкрэслівае выключныя адносіны да яго пасля катастрофы з боку цэнтральных і мясцовых улад Чуваш.

Філіповіч з захапленнем адзываецца аб саўтасе, які ён наведаў і ўказвае, што чувашскі народ у культурных і эканамічных адносінах зрабіў велізарныя крокі наперад.

„ЧЭЛЮСКІН" НАБЛІЖАЕЦЦА ДА БЕРЫНГАВА ПРАЛІВА

«ЧЭЛЮСКІН», 7. (БЕЛТА).

Сёння «Чэлюскін» мінаваў востраў Ідыліта і набліжаецца да мыса Сэрца—Камень, адкуль астаецца 120 клм. да Берынгава праліва.

Пад напорам ільдоў патануўся баллер руля, што значна перашкаджае павароту, асабліва ўправа. Не гледзячы на гэта, паспяхова рушым наперад.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЖАКТ

ПРОЛЕТАРСКАЙ СТАЛІЦЫ—УЗОРНУЮ ЧЫСТАТУ!

◆ ЧАРГОВЫ СХОД ДВОРНІКАЎ су месна з загадчыкамі дамоў і старшынямі праўленняў жактаў (9-га кастрычніка), прысвечаны конкурсу на лепшы жакт, быў вельмі шматлюдным. Каля 500 чалавек сабралася ў клубе імя VII з'езда прафсаюзаў. На парадку дня пытанні аб чыстаце, аб падрыхтоўцы горада да кастрычніцкіх свят.

— Мы маем вялізарныя дасягненні ў галіне жыллёвага і камунальнага будаўніцтва, — гаварыў дакладчык, прад стаўнік міліцыі тав. ДЭРМАН. — Мы пабудавалі заводы-гіганты, вялікія шматпавярховыя дамы, выбрукавалі ред вуліц клінкерам і брушчаткай, пра вялі каналізацыю. Разам з тым паглядзеце, што робіцца на некаторых вуліцах і дварах... Кожную вуліцу і кожны двор можна адрозніць па іх спецыфічных запахах. Скрозь і ўсюды жыхары выпляваюць нечыстоты проста каля сваіх дзвярэй. Горад вельмі забруджан. І задача дворнікаў — актыўных удзельнікаў конкурса на лепшы жакт — прывесці горад у такі выгляд, каб не сорамна было спаткаць вялікае свята Кастрычніцкай рэволюцыі.

◆ РАД АБСЛЕДВАННЯЎ ДВАРОЎ праявіла міліцыя за апошнія дні. Рэдка які двор не быў занесен у блок-нот міліцыянера. Тут клясраўны паглынаючыя студні, там раскіданы прыбіральні, далей паламаны брамы і тратуары, пазалены платы, перапоўнены смяццёвыя скрыні — усюды бруд, анты санітарыя... Прахадзіш міма якога-небудзь двара і здаецца, быццам у гэтым раёне здарылася землятрасенне, або ўраган вялікай сілы пранёсся, разбурыўшы і раскінуўшы ўсё на сваім шляху. У выніку гэтых абследванняў былі складзены спісы, «ЧОРНЫЯ СПІСЫ», як іх назвалі на сходзе. Яны ахапляюць 25 ЖАКТАЎ, больш 1/3 жактаў горада. Вось яны, ворагі чыстаты і санітарыі, ворагі цэлых тратуараў і брам, ворагі афарбаваных платоў! №№ 3, 4, 5, 6, 8, 9, 12, 16, 25, 26, 27, 29, 31, 32, 35, 39, 40, 43, 44, 46, 47, 50, 52, 53, 54...

◆ НАЙБОЛЬШ КРЫЎДНА, што ў гэтыя спісы трапілі жакты, якія не кепска ўключыліся ў конкурс (напрыклад, 12,32, 35). У 35-м жакце нават пастанавілі арганізаваць МАСАВЫ СУБОТНІК па ачыстцы двароў ад смецця. Але, відаць, ад пастановы да канкрэтнай справы — вялікая дыстанцыя. Ляг чэй напісаць пратакол, чым арганізаваць суботнік. Трэба яшчэ раз палярэдзіць, што конкурсная камісія будзе расцэньваць работу жактаў не паводле пастановаў, а выходзячы з канкрэтных спраў.

◆ СЛАБА УЦЯГНУТЫ Ў КОНКУРС ДВОРНІКІ. Многія жакты яшчэ не зрозумелі, што дворнік з'яўляецца ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ КОНКУРСА, што на дворніка трэба галоўным чынам абапірацца ў правядзенні ўсіх умоў конкурса ў справе чыстаты і санітарыі. Сярод дворнікаў яшчэ слаба развіта самакрытыка. Некаторыя з іх імкнуцца ўсю віну за бруд і антысанітарыю зваліць на жыхароў, на транспарт, на загадчыкаў дамоў і г. д. Праўда, шмат абаперліся ў жыхары, і транспарт, і загадчыкі дамоў. Але кепска тое, што дворнікі НЕ АДЧУВАЮЦЬ СВАЁЙ ВІНЫ. Гэта вынік таго, што праўленні жактаў яшчэ не ўцягнулі дворнікаў у актыўную барацьбу за ўзорную чыстату, не ўключылі іх у рады актывістаў, грамадскіх работнікаў. Таму немала выпадкаў, калі дворнікі стаяць у баку ад конкурса, не лічаць дабрабыт горада сваёй справай, а некаторыя, як гэта паведаміў прадстаўнік міліцыі, замест сумленных адносін да сваіх абавязкаў п'янствуюць і па 3-4 дні не выходзяць на работу.

◆ ДВОРНІКІ ГОРАДА павінны ўзяць прыклад з дворніцы 25-га жакта тав. СТАНКЕВІЧ КАЦЯРЫНЫ, выклікаўшай на соцыялістычнае спаборніцтва дворніка КУРОЦКАГА на лепшае абслугоўванне двароў, прыбіральняў, сметнікаў. Дворнік ШЫЛАК, з таго-ж жакта, выклікаў на соцспаборніцтва дворніцу ШУЛЬЦ МАРЫЮ і дворніка ПАТАЛЕЯ. Усе яны бялізны на сябе соцыялістычныя абавязацельствы выконваць работу добрасумленна і добраякасна, змагаецца за 100 проц. выкананне фінплана, выяўляць чужыя элементы ў жакце, прымаць актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах праўлення жакта. Толькі такімі метадамі — МЕТАДАМІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА — ім удасца зняць свой жакт з «чорнага спіса».

— З усіх сіл возьмемся і ачысцім двары і вуліцы да нашага дарагога пролетарскага свята, — заявіла на сходзе дворніца СТАНКЕВІЧ.

◆ НА «АБ'ЕКТЫЎНЫЯ» ПРЫЧЫНЫ прабуюць спасылацца і некаторыя праўленні жактаў, напрыклад, праўленне жакта № 46. Рад дамоў жакта знаходзіцца па Рэспубліканскай вуліцы, дзе пракладваецца трамвайная лінія. Праўда, заезд у двары крыху затруднён, але гэта не значыць, што праезд зусім немагчымы. З дапамогай дворнікаў або нават спецыяльна нанятых чорнарабочых можна адкінуць каменні ад брам, папажыць сям-там пару дошак і даць магчымасць транспарту праехаць. Але праўленне жакта (старшыня праўлення РЫЕР) рада хоць вон кавай прычыне і на працягу года амаль не чысціла двароў ад смецця. Гаржыльсаюз і часткова міліцыя ПРЫМІРЭНЧА адносяцца да такіх паводзін жактаўскіх кіраўнікоў. За такую нядбайнасць і бяздзейнасць мала штрафаваць, трэба аддаваць пад суд.

◆ ГАРАДСКІЯ АСАБОЗЫ НЕ НАГРУЖАНЫ. Аб гэтым на сходзе заявіў нам, старшыні праўлення гаржыльсаюза тав. ТРУСКІН. Ён агітаваў сход за тое, каб нагрузіць асабозы, даць ім работы. Трэба, моў, коняй карміць, рабочым зарплату выдаваць і г. д. У той-жа час на сходзе быў рад заяў, што асабозы бяруць у жактаў і іншых арганізацый буйныя грашовыя авансы, але не пакрываюць іх. 11-я школа ўнесла ў аддзел ачысткі 200 руб., але асабоз да работы не прыступае. Старшыня праўлення жакта № 63 тав. ШАБАНАЎ заявіў, што жакт уносіць грошы за ачыстку ўперад, але ачысткі не праводзяць. Гаржыльсаюз гэтымі справамі не хоча займацца, на скаргі жактаў не рэагуе. Усе гэтыя выступленні выклікаюць падазронасць, што асабозы вядуць нейкую несумленную гульню—грошы бяруць для пакрыцця сваіх выдаткаў, але з ачысткай не спяшаюцца. РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ ГАРЖЫЛСАЮЗА, якая, мяркуючы па некаторых даных, бяздзейнічае, павінна заняцца праверкай грашовых операцый і запазычанасці асабоза гаржыльсаюза (дырэктар БРУДНЕР) а нямгас павінен праверыць работу свайго гарадскога асабоза (дырэктар ЛОНГІН). Гаржыльсаюз і нямгас павінны стварыць усе ўмовы для таго, каб палегчыць жактам выкананне задач конкурса.

◆ ДА 1-га ЛІСТАПАДА — сканчэння конкурса — застаецца ўсяго толькі дзве дэкады. За гэты час трэба многае паспець. Трэба ператварыць сталіцу БССР у горад сапраўды ўзорнай чыстаты. Да XVI гадавіны Кастрычніка трэба ачысціць кватэры, двары і вуліцы ад бруда і смецця. Трэба, каб вуліцы распазнаваліся не па паху, а каб яны БЫЛІ ВАРТЫ СВАІХ РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ НАЗВАЎ. З гэтай вялікай задачай параўнальна невялікі штат дворнікаў не справіцца. ПАТРЭБНА АКТЫЎНАЯ ДАПАМОГА ЎСЁЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ, патрэбны МАСАВЫЯ СУБОТНІКІ ЧЛЕНАЎ ЖАКТАЎ, патрэбен актыўны ўдзел у іх кожнага свядомага грамадзяніна пролетарскай сталіцы, КОЖНАГА РАБОЧАГА, РАБОТНІЦЫ, кожнай ХАТНЯЙ ГАСПАДЫНІ.

АБ ЗМЕНЕ АРТ. 94 КРЫМІНАЛЬНАГА КОДЭКСА БССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць арт. 94 крымінальнага кодэкса БССР (З. З. БССР 1932 г., № 58, паст. 268 і 1932 г., № 74 паст. 369) у наступнай рэдакцыі:

«94. Адмаўленне пасобных грамадзян выконваць павіннасці і работы, якія маюць агульна-дзяржаўнае значэнне, выклікае штраф, які накладаецца адпаведным органам улады, у межах да пяцікратнага размера кошта павіннасці або работы.

Такія самыя дзеянні, калі яны ўчыненыя ў другі раз, або злоснае адмаўленне выконваць паказаныя павіннасці і работы, хоць-бы і ў першы раз — прымусовыя работы да аднаго года або пазбаўленне волі да трох год.

Такія самыя дзеянні, калі яны ўчынены кулакамі, хоць-бы і ў першы раз — пазбаўленне волі не менш як на тры гады з канфіскацыяй маемасці».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЕЎКОЎ.
9 кастрычніка, 1933 г.

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ І БЫТА

Першыя электра-парнікі

Праз месяц-паўтара ў саўгасе Лошыца пад Менскам пачнецца эксплоатацыя электра-цэпліц і электра-парнікоў, у якіх зімою будуць вырошчвацца радыска, гуркі, памідоры і іншая гародніна. Гэта першы вопыт ЭЛЕКТРЫЧНАГА ПАДАГРЭВА ГЛЕБЫ ў БССР спецыяльнымі электрычнымі спіралямі. Такія-ж электра-парнікі будуць зроблены ў саўгасе Вязынь-Фанітапь.

Расце электраўзброенасць сельскай гаспадаркі

У БССР з кожным днём павялічваецца ўжыванне электрычнай энергіі пры малацьбе і сэпараванні. За апошнія два тыдні колькасць электракопак павялічылася з 84-х да 122. На 20 пунктах электрамалацьбы электразбіваннае эксплоатуюць САМІ КАЛГАСНІКІ, з якімі праведзен адпаведны інструктаж. У ліку электрабаставання ёсць 4 ПЕРАСОВАЧНЫЯ ФУРГОНЫ, у якіх змяшчаюцца трансфарматар і матор. Перасоўваючыся па лініях высокавольтных перадач, фургоны спыняюцца ў месцах знаходжання вялікіх мас збожжа, уключаюцца ў лінію перадач і выконваюць рад сельска-гаспадарчых работ. Электрамалацьба і электразбіванне даюць вялікі эканамічны эфект, эканомячы дзесяткі тысяч трактарагадзін і працадзён калгаснікаў.

Паведамленні

Менгарком КП(б)Б склікае 11-га кастрычніка г. г., у 7 гадзін веч., у Доме комасветы (малая аўдыторыя, вуліца Карла Маркса) нараду агітмасаў і агітатараў партколектываў і ячэек па пытанню аб падрыхтоўцы да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

АГІТМАС ГК КП(б)Б.

Менская гарадская камісія па чыстцы партыі ў другі раз даводзіць да ведама ўсіх партыйных ячэек і ячэйковых камісій па чыстцы, што для прыёма розных заяў, скаргаў і паведамленняў установлены дзяжурныя апарата гарадской камісіі ў рабочыя дні з 7-мі да 10 гадзін вечара і ў выходныя дні — з 10 да 4-х гадзін дня.

Камісія змяшчаецца ў будынку гарКК КП(б)Б, Карла Маркса, 14, 2-гі паверх, пакой 22.

Сакратарыят менскай гарадской камісіі па чыстцы.

Сакратарыят менскай гарадской камісіі па чыстцы прапануе ніжэйпералічаным т. т., выключаным з партыі, здаць партыйныя білеты менскай гаркамісіі:

ПІКУЛІК П. К. (партколектыў завода імя Молатава, парт. білет № 3742486); КУБРЫНСКІ В. А. (паркал. Эльвода, парт. біл. № 1087559); ШАБУНЕВІЧ В. І. (паркал. Эльвода, біл. № 0815527); БРЭГМАН І. Ш. (паркал. ВКСШБ, біл. № 1818504); ФІШКІН І. С. (паркал. хлебазавода, біл. № 1299641)

Сакратарыят Менгаркомісіі па чыстцы КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Ч. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР
вул. ВАЛАДАРСКАГА
ДАМЭЦ МЮЗІК-ХОЛ
ГАСТРОЛІ ЭЎРАПЕЙСКАГА АТРАКЦЫЁНА
КІО
з яго 17 асістэнтамі.
ВЫКЛЮЧНЫ СПЕКТАКЛЬ.
Пач. у 8 г. 30 м. веч. Каса—зд 12 г. дня

ДЗЯРЖЦЫРК 11, 12 кастрычніка АПОШНІЯ ДВА ДНІ
па агульнадаст. цэнах ад 60 к. да 3 р.
ЗАКРЫЦЦЕ СЕЗОНА
2 групы драпежнікаў у вдзін вечар
ЛЬВЫ І ЛЕАПАРДЫ
9 львоў і 5 леапардаў
КАРМЛЕННЕ ЗВЕРАЎ НА АРЭНЕ
усмірыцель Б. ЭДЭР
У ПРАГРАМЕ ПРЫМАЕ УДЗЕЛ УСЯ ТРУПА
Пачатак у 8 г. 30 м. веч. КАСА—з 12 г. дня
12 кастрычніка два ранішнікі—у 12 і 4 г. дня

ДЗІЦЯЧЫ гукавы кіно-тэатр 11, 12 і 13 кастрычніка АПОШНІЯ 3 дні
мастацкі гукавы фільм
ЗЛАТЫЯ ГОРЫ
Пачатак сеансаў: 11 г. ран., 3 г., 5 г., 7 г., 9 гадз. веч.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. РОБІН ГУД драма ў 9 част.
Кіно Інтэрнацыянал КВЕТКА КАХАННЯ
Кіно „Пролетарый" 2-я—заключная серыя Стальны чалавек
„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. Замежны мастацкі фільм Паташ і Перламутр Камедыя ў 10 частках

Цэнтральная камісія садзейнасці дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры прэзідыуме ЦВК БССР, Менгаркамсад і гарпрафсовет, кіраўніцтва АК і ДК БССР
склікаюць
СЁННЯ, 11 кастрычніка а 6-й гадзіне вечара ў памяшканні ЦВК БССР (Плац Волі, 17) у зале пасяджэнняў
шырокую нараду шэфкустоў і шэф'ячэек, шэфствуючых над сельскімі саветамі і калгасамі.
на пытанні
аб мерапрыемствах на IV квартал па выкананні фінплана
добраахвотных плацяжоў і абслугоўвання пазыкатрымальнікаў
На нараду павінны з'явіцца старшыні шэфкустоў і шэфячэек, старшыні фабзаўмясцкомаў, старшыні камсодаў дзяржкрэдыту і ашчадсправе і касы ашчадкасці.
Яўка абавязкова і без спазнення.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЯЛІКІ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ 2 СУСТРЭЧЫ 2

„ТОРГСІН" СССР
Беларуская кантора
даводзіць да ведама насельніцтва, што у мэтах лепшага абслугоўвання пераводаатрымальнікаў,
агенцтва „ТОРГСІН" з памяшкання Дзяржбанка
ПЕРАВОДЗІЦЦА Ў НОВАЕ ПАМЯШКАННЕ, па Комсамольскай, 15.
Пераводныя аперацыі будуць вытварацца штодзенна, з 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін дня, і ў выхадныя дні.
Беларуская кантора „ТОРГСІН".

Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут у гор. Горках абвяшчае НАБОР
на падрыхтоўчыя курсы студэнтаў, снага набора ў інстытут у 1934 г.
На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй сямігодкі. Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй, станоўкай і інтэрнатам ні агульных падставах са студэнтамі.
Апрача таго, інстытут абвяшчае НАБОР на курсы па падрыхтоўцы ў інстытут асеннага набора 1934 г. у колькасці 500 асоб.
Асобы, не залічаныя з 3-месячных курсаў у ВНУ, будуць пераведзены на 8-месячныя курсы асеннага набора 1934 г.
Дырэктар Беларускага сельска-гаспадарчага інстытута Барыкевіч.

МЕНСКІ РАБОЧЫ САНІТАРНЫ УНІВЕРСІТЭТ
АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ
Прыём заяў да 14 кастрычніка ў доме санітарнай асветы (пл. Волі, 23-2) ад 3-х да 8 г. веч.
ДЫРЭКЦЫЯ

У аддзел аб'яў званецца па тэлефону 21-360

ПАСТАНОВА № 25

Прэзідыума менскага гарадскога совета ад 18-IX

Аб мерапрыемствах па абмежаванню асення-зімовага максімума нагрузак МГЭС

Адзначыць, што пры поўным скарыстанні магутнасці МГЭС у часе асення-зімовага максімума 1932-33 г. у 6.800 квт., уключэнне новых спажыўцоў у летні час 1933 г. на 400 квт., да асення-зімовага максімума 1933-34 г. прад'яўляюць попыт новыя важныя аб'екты на 2.600 квт., такім чынам, стварэцца дэфіцыт у электрамагутнасці МГЭС да наступнага асення-зімовага максімума ў 3.000 квт.

З мэтай частковага пакрыцця адзначанага дэфіцыта і задавалення новых, найбольш важных спажыўцоў, прад'яўляючых попыт на электраэнергію ў гэтым годзе, прэзідыум гарсовета **пастанаўляе:**

1. Скараціць магутнасць спажыўцоў, прымаючых удзел у петашнім максімуме, на 1.500 квт.: за кошт прамысловасці 800 квт., устаноў — 400 квт. і прыватных спажыўцоў — 300 квт.

Для забеспячэння гэтай эканоміі ў 1.500 квт., прэзідыум гарсовета прапануе прарабіць наступнае:

а) частку прадпрыемстваў перавесці з вячэрняй работы на начную змену (спіс дадаецца);

б) прадпрыемствам, якія па ўмовах работы не могуць быць поўнасцю пераведзены на начную змену, скараціць карыстанне ў вячэрні час за кошт часткового перанясення нагрузак з вячэрняй на начную змену.

2. Прапанаваць усім прадпрыемствам скараціць магутнасць спажываемай імі электраэнергіі на мэты асвятлення на 20 проц., забараніўшы карыстанне электраэнергіяй для вентыляцыі і нагрэвальных мэт пры наяўнасці магчымасці выкарыстання неэлектрычных установак.

Разбіць усю спажываемую магутнасць на маторы першай і другой неабходнасці з тым, каб апошнія складалі не менш 25-30 проц. усёй магутнасці і павінны выключацца па першаму патрабаванню станцыі і прадпрыемстваў пры працяжным змяншэнні напружанасці.

3. Забяспечыць максімальнае змяншэнне непрадукцыйных страт і давядзенне каэфіцыента магутнасці прадпрыемства да велічыні не менш 0,7, паперадзіўшы, што прадпрыемствы з больш ніжім каэфіцыентам магутнасці будуць аштрафаваны і па ледзяанню электрастанцыі будуць выключацца, як злосныя распаўтчыкі дэфіцытнай электраэнергіі.

4. Цэтральным максімальна напружыць работу дзённай і начной змен, скончыўшы работу заводаў да 15 гадзін дня.

5. Для забеспячэння жорсткага кантроля за выкананнем прадпрыемствамі намечаных мерапрыемстваў, прапанаваць МГЭС узмацніць свой кантралёрскі штат. Абавязаць прадпрыемствы з 15-Х штодзённа прадстаўляць характэрны суткавы графік спажываемай энергіі, за правільнасць якога адказвае дырэктар прадпрыемства.

6. Прапанаваць дырэкцыям заводаў «Большэвік», імя Молатава, імя Мяснікова, «Беларусь» і абойнай фабрыцы поўнасцю падрыхтаваць да 15 кастрычніка свае ўласныя сілавыя ўстаноўкі, дабіўшыся максімальнага выкарыстання іх магутнасці і бесперабойнай работы ў вячэрняй і дзённай змены.

7. Прапанаваць МГЭС адключыць у кіёсках вышэйпаказаных прадпрыемстваў трапфарматары-рэзервір, уласныя ўстаноўкі; прадпрыемствам па кожнай чакаемай астаноўцы ўласнага рухавіка — загадзя папярэджваць МГЭС.

8. Для зніжэння раннягa піка нагрузкі і больш роўнамернага размеркавання нагрузкі на працягу 6-дзённі абавязаць прадпрыемствы перабудаваць пачатак работы і пікалу выхадных дзён, згодна ўказанняў МГЭС.

9. Прадпрыемствам з адной зменай работы частку сваёй нагрузкі перавесці на начную змену (спіс дадаецца).

10. Прапанаваць усім установам у перыяд асення-зімовага максімума з 15 кастрычніка скараціць спажыванне электраэнергіі на 20-25 проц. па ўказаннях МГЭС. Дазволіць МГЭС браць у патройным размеры за электраэнергію выдаткі звыш устаноўленай нормы, і выключэнне. злоснапераўдаткоўваючых электраэнергію.

11. МГЭС устанавіць норму магутнасці лямп для асвятлення прыватных памяшканняў ад 2 з пал. да 4 ват на квадрат